Галіна Каржанеўская

# *Не можа быць*

Міні-п’есы

Мінск
“Ковчег”
2010

www.kamunikat.org

УДК 821. 161. 3-2
ББК 84 (4Беи)-6
К66

**Каржанеўская, Г. А.**
К66 Не можа быць : міні-п’есы / Галіна Каржанеўская. – Мінск : Ковчег, 2010. – 78 с.

ISBN 978-985-6950-18-9

Зборнік п’ес для аматарскіх тэатраў
і школьных драматычных гурткоў.

**УДК 821. 161. 3-2**
**ББК 84 (4Беи)-6**

**ISBN 978-985-6950-18-9**

© Каржанеўская Г. А., 2010
© Афармленне.
ТАА “Ковчег”, 2010

www.kamunikat.org

# *П'есы для дарослых*

www.kamunikat.org

# НЕ МОЖА БЫЦЬ!

Сцэнічная гумарэска для дарослых

Дзейныя асобы:

АСА
ПЧОЛКА
МАТЫЛЬ
СМОЛКА, МЕДУНІЦА,
РАМОНАК ЗВАНОЧАК, іншыя кветкі;
КАРОВА

## Карціна 1.

Квітнеючы луг. На сонца напаўзае хмара. П ч о л к а ў фартушку і з вядзерцам заклапочана пазірае на неба.

ПЧОЛКА. Хмара… Каб знаў не намокнуць. А ў маім вядзерцы – на дне.

З’яўляецца А с а ў какетлівым празрыстым жоўтым уборы і з сумачкай.

АСА. Усё шчыруеш? Адпачыла б, сяброўка.

ПЧОЛКА. Адпачну, як сонца зойдзе.

АСА. Прырода проста звар’яцела. Лета – не лета і зіма – не зіма… Так яны ўвогуле могуць зраўняцца, і тады настане альбо суцэльная позняя восень…

ПЧОЛКА. Альбо ранняя вясна, калі і холадна, і голадна…

АСА. І тое, і другое кепска. Нам, легкакрылым, нельга без цяпла і сонца.

ПЧОЛКА. І без працы таксама.

АСА. Гледзячы якой. Калі з рання да цямна – прабачце, я не рабыня Ізаўра.

ПЧОЛКА. Кожнаму – сваё *(уздыхнула).*



www.kamunikat.org

АСА. Я ж табе прапаноўвала – падпішыся пад мяне, створым цэлую сетку. Дабаўкі – гэта залатое дно! Падпішашся?

ПЧОЛКА *(пазіраючы ўгару).* Капае.

АСА. Табе здалося.

ПЧОЛКА. А я гавару – капае. Во, глядзі… Давай перачакаем.

Яны хаваюцца пад лапух, пры гэтым Аса зачапілася
і парвала спаднічку.

А-а, блін! Першы раз апранула, можна сказаць!

ПЧОЛКА. Па шву парвалася, зашыеш.

АСА. Я не з тых, хто зашывае падранае. Не каралеўская гэта справа.

ПЧОЛКА. Я і калготкі ўвесь час зашываю…

АСА. А я зноў на дыету села.

ПЧОЛКА. І што?

АСА. Ужо ёсць вынікі. Талія стала вузей на паўсантыметра!

ПЧОЛКА. Так пераламацца можна…

АСА. Хутчэй ты пераломішся, цягаючы свае вёдры… Кожнай кветцы кланяцца – не, гэта не па мне.

ПЧОЛКА. Калі трэба, то і пакланюся. З мяне шапачка не ўпадзе.

АСА. Нездарма цябе кветкі гэтак любяць. *(Паўза.)* Дарэчы, ці чула? У іх там скандал: Матыль са Смолкай разышліся.

ПЧОЛКА. Разышліся ці развяліся?

АСА. Спытай у іх.

ПЧОЛКА. Ёсць у мяне час у чужое жыццё лезці!

АСА. Ну так. Тут бы сваё да давесці ладу. *(Паўза.)* Зірні, ідуць! Лёгкія на паміне. *(Прыхоўваюцца.)*

Ідуць С м о л к а і М а т ы л ь. Трымаюцца адчужана,
Смолка ўсхліпвае.

СМОЛКА. Дзе мае вочы былі? Чым я думала?

МАТЫЛЬ. Чым, чым… Тым жа, чым усе закаханыя думаюць.

СМОЛКА. Лета толькі пачалося, а жыццё ўжо сапсаванае…

МАТЫЛЬ. Бо ліпучая занадта.

СМОЛКА *(абураная).* Я, я ліпучая?! Я Смолка, а не ліпучка! Ты сам мне праходу не даваў! Дзень і ноч чапляўся! Ды я расцвісці толкам не паспела, як ты аднекуль зваліўся на маю галаву!

МАТЫЛЬ. Правільна. Мяне карова хвастом збіла, вось і зваліўся. Я зусім не цэліўся, каб упасці акурат на цябе.

Аса з Пчолкай ціха смяюцца, заціскаючы раты.

СМОЛКА. Выхадзіла яго, вылечыла, адкарміла… І во – падзяка! Вер пасля гэтага мужчынам.

МАТЫЛЬ. А-а, з табой гаварыць!.. *(Збіраецца пайсці.)*

СМОЛКА. Давай, давай! Бяжы да сваёй паласатай! Даўно цябе чакае.

ПЧОЛКА *(штурхае Асу ў бок, шэптам).* Пра цябе.

АСА. Ціха!

СМОЛКА. Тая непераборлівая, усе ведаюць...

ПЧОЛКА (*скрозь зубы*). Ты мне адкажаш, даражэнькая, за такія словы...

СМОЛКА. Але там не разгуляешся! Там цябе ўміг запрагуць і ваду вазіць будуць. Калі чмяля па руках-нагах скруціла, то цябе…

МАТЫЛЬ *(пацепваецца)*. Усе вы добрыя. Пакуль спіцё.

ПЧОЛКА *(шэптам)*. Чыстая праўда!

СМОЛКА. З-за каго я плакала? З-за каго слёзы ліла?

МАТЫЛЬ. Ты ў мяне пытаешся?

СМОЛКА. У госпада Бога.

МАТЫЛЬ. Дык ён няхай і адказвае. А не магу тут болей з табою мокнуць.

Матыль залазіць пад лапух – і натыкаецца на Пчолку з Асою.

АСА *(шыпіць).* Ану вымятайся адсюль!

ПЧОЛКА. Ён жа намокне.

АСА. Як намокне, так і высахне. А мне лішнія сцэны не да чэго.

ПЧОЛКА. Раней ты не баялася ніякіх сцэн. Сама іх устройвала.

МАТЫЛЬ. І якія!



www.kamunikat.org

Смолка пачула шэпт і зазірнула пад лапух. Пры гэтым згледзела, як Матыль абшчаперыў талію Асы.

СМОЛКА. А-а, тут цэлае асінае гняздо! Акапаліся!

МАТЫЛЬ. Я паляцеў. (*Знікае*.)

ПЧОЛКА *(вызіраючы).* Ды ўжо няма ніякага дажджу. *(Выходзіць са сховішча.)* Ой, вядзерца забылася! *(Бярэ вядзерца і пачынае працаваць.)*

Аса робіць выгляд, што цалкам занята сваёй сумачкай.

СМОЛКА *(пагрозліва).* Вы чым там займаліся?

АСА (*нявінна*). З Пчолкай?

СМОЛКА. У некаторых істотаў сумлення ні вось столечкі (*паказвае*). Ні грама, ні паўграма...

АСА. Пры чым сумленне, калі жыццё кароткае? Колькі таго лета! І ўвогуле... Ёсць навіна, для некаторых непрыемная. Заўтра пачынаюць касіць луг.

СМОЛКА. Заўтра?!

АСА. А што? Даўно пара. Ну, мне пара, дарагуша. (*Пайшла, напяваючы “Вот и лето прошло, словно и не бывало”...*)

## Карціна 2.

Р а м о н а к з М е д у н і ц а й прыселі на траву. Рамонак з блакнотам і гусіным пяром.

РАМОНАК (*натхнёна*). “Медуніца, медуніца, непагоды не баіцца...” Ну як?

МЕДУНІЦА. Гучыць-то хораша... Але як з праўдай жыцця? Мы, кветкі, баімся і граду, і спёкі, і каровы...

РАМОНАК. Ды ўсяго мы баімся. Але ж гэта, зразумей, проза. А паэзія... Паэзія – гэта калі ты адкрыты цэламу свету... Разумееш? Вось так, (*паказвае*) наросхрыст.

МЕДУНІЦА. Глядзі, прастудзішся...

РАМОНАК. Не перабівай. (*Думае*.) “Медуніца, медуніца, ты на лузе, як царыца”. Во, знайшоў!

МЕДУНІЦА. Зноў хораша. І зноў няпраўда. Царыца – гэта калі півоня альбо вяргіня, а я простая лугавая кветка.

Ідзе ўсхваляваная Смолка.

СМОЛКА *(сама сабе).* Не можа быць!.. Не можа быць!..

МЕДУНІЦА *(жартам).* А я лічу, што вельмі нават можа. *(Смолка не рэагуе.)* Эй, Смолка!

РАМОНАК (*шэптам*). У яе стрэс на любоўнай глебе.

МЕДУНІЦА . На голы лес, гэтыя стрэсы…

СМОЛКА *(сабе).* Сто нязробленых спраў… А я як апошняя дурнічка… раскісла... разнюнькалася... Перад кім?

МЕДУНІЦА. Зусім, бедная, не ў сабе…

СМОЛКА *(як прачнуўшыся).* Дзе наш ціхоня?

МЕДУНІЦА. Хто?

СМОЛКА. Званочак. Ён у нас адказвае за апавяшчэнне.

РАМОНАК. Што здарылася?

МЕДУНІЦА. Штосьці, відаць, сур’ёзнае...

СМОЛКА. Вечарам збіраем актыў. Будзе сход. (*Рамонку.*) Збяры ты, калі ласка.

Набліжаецца Пчолка з вядзерцам, нагінаецца да кожнай кветкі. Медуніца падбегла і абняла яе.

МЕДУНІЦА. Добры дзень, працаўніца ты наша!

ПЧОЛКА. План павялічваюць і павялічваюць… *(Кветкам.)* Вы сёння пылок здавалі?

МЕДУНІЦА. Здавалі.

РАМОНАК. А я не ахоплены.

МЕДУНІЦА *(Рамонку).* Табе што сказалі? Бяжы, збірай народ.

ПЧОЛКА. А што такое?

СМОЛКА. Дужа непрыемная навіна. Пакуль сказаць не магу.

ПЧОЛКА. Хто паведаміў?

СМОЛКА. Твая прыяцелька… ў палоску.

ПЧОЛКА. Аса? Дзіўна, а мне яна ні слова… Дзіўна... (*Пайшла.*)

СМОЛКА *(сабе).* Значыць, і Матыль ведаў. Ведаў – і не сказаў. Чакайце, я зараз. *(Некуды падалася.)*

**Карціна 3.**

Матыль бесклапотна сядзіць на траве і жуе травінку.
Бяжыць Смолка.

СМОЛКА *(задыхаецца ад гневу).* Ты… ты… Ты проста нягоднік! *(Замахваецца на яго.)*

МАТЫЛЬ *(усхапіўся).* Лягчэй на паваротах!

СМОЛКА. Ты ведаў! Ведаў і не папярэдзіў! Ты… ты…

МАТЫЛЬ. Што я ведаў?

СМОЛКА. Што заўтра луг пачынаюць касіць.

МАТЫЛЬ (*агаломшаны*). Заўтра? Не можа быць.

СМОЛКА. Хочаш сказаць, што першы раз чуеш? Не выкруцішся, даражэнькі! Ты ведаў! Вы нездарма там пад лапухом шапталіся…

МАТЫЛЬ. Хто шаптаўся?

СМОЛКА. Значыць, так. Мы аб'яўляем табе байкот. Не смей набліжацца ні да якай кветкі.

МАТЫЛЬ. Ты мяне і так з усімі на лузе пасварыла. Захацела быць адной-адзінай… Ты думаеш, што калі цябе выбралі ў лугавую раду…

СМОЛКА. Нічога я не думаю.

МАТЫЛЬ. Ды і не косяць каторы год. Няма кароў – не трэба сена.

Паблізу чуваць працяглае "Му-у-у…"

СМОЛКА. Парнакапытнае! Накаркаў!

МАТЫЛЬ. Ідзе сюды.

З'яўляецца К а р о в а. Яна на прывязі і рухаецца па крузе.

МАТЫЛЬ *(Смолцы).* Хавайся! *(Карове, паважліва.)* Добрага здароўя вам!

КАРОВА. Не скарджуся, дзякуй богу!

МАТЫЛЬ. Чаму адны тут пасіцёся?

КАРОВА. А я гаспадарская, на вольным выпасе. Праўда, які ён вольны? *(Паказвае на вяроўку.)* А мне расказвалі, што ў свеце яшчэ ёсць такія запаведныя мясціны, дзе каровы самі пасуцца ўсё лета і нават рэчкі пераплываюць.



www.kamunikat.org

МАТЫЛЬ. Байкі!

КАРОВА. Мая гаспадыня граматная, усё ведае.

МАТЫЛЬ. А вы не чулі, выпадкам, што заўтра луг касіць збіраюцца?

КАРОВА (*хітае галавой*). Не можа быць. Навошта яго касіць, калі ёсць я? Я тут прывыкла: і трава сакавітая, і цянёк ёсць… За дзень добрую лапіну апрыходую...

Смолка высунулася з-пад куста, слухае.

МАТЫЛЬ *(робіць знакі).* Знікні! *(Карове.)* Спытайце ў сваёй граматнай бабулі, можа, яна ведае.

КАРОВА. Люблю паважлівае абыходжанне. Малачка хочаш?

МАТЫЛЬ (*аблізваючыся).* Не-а. Нельга мне. Алергія.

КАРОВА. Ну глядзі. А я спытаю абавязкова. *(Знікае з вачэй.)*

Бягуць Рамонак са З в а н о ч к а м.

РАМОНАК *(Смолцы).* Усіх паклікалі! Усе будуць!

ЗВАНОЧАК (*звоніць*). Рада на захадзе сонца! Рада на захадзе сонца! *(Пабеглі далей.)*

СМОЛКА. Каб ведала, што так мала часу засталося… Навошта ўсё гэта – сваркі, рэўнасць, непаразуменні, калі заўтра мы можам не прачнуцца?

МАТЫЛЬ. А можа й пранясе.

СМОЛКА. Табе – што? На іншы луг пераляціш, знойдзеш яшчэ адну... ліпучку. Прыстойны мужчына, дарэчы, даўно б папрасіў прабачэння. (*Матыль маўчыць.*) Ну, твая справа. Бывай! (*Пайшла.*)

МАТЫЛЬ *(сабе, гледзячы на гадзіннік).* У пяць спатканка з Асою. І што ёй трэба ад мяне? Аса так проста не прызначыць.

**Карціна 4.**

Аса на арэлях, Матыль яе злёгку гайдае.

АСА. Нейкі доўгі сёння дзень. Ну проста бясконцы.

МАТЫЛЬ. Гэта ад незанятасці.

АСА. Не скажы. Масаж, манікюр, педзікюр... Табе падабаецца новы колер маіх валасоў?

МАТЫЛЬ. Колер як колер.

АСА. Ад цябе, бачу, кампліментa не дачакаешся. (*Паўза.*) А праўда, што ты сваю справу распачынаеш?

МАТЫЛЬ. Што за луг! Усе пра ўсё ведаюць!

АСА. Вытворчасць капялюшыкаў для кветак – гэта класная задума.

МАТЫЛЬ. Праўда? Табе падабаецца мая ідэя?

АСА. Я проста ў адпадзе. Нават больш. Магу аказаць пасільную дапамогу.

МАТЫЛЬ. Якую?

АСА. Буду мадэллю ў тваім атэлье. Трэба ж некаму дэманстраваць твае модныя вырабы. А мне ў гэтай справе роўных няма, скажу без лішняй сціпласці. А не, дык займуся рэкламай… А магу і бухгалтэрыю весці… Што скажаш?

МАТЫЛЬ. Я падумаю. *(Перастае гушкаць.)*

АСА *(неахвотна злазячы з арэляў).* Парыць. *(Пазяхнула.)* А што гэта кветкі нейкія ўстрывожаныя?

МАТЫЛЬ. У іх перапалох: нібыта заўтра пачатак касьбы.

АСА (*прытворна*). Не можа быць!

МАТЫЛЬ. Так нечакана… І для каго я капялюшыкі буду вымоджваць?

АСА. Жыццё, дарагі мой, непрадказальнае. Чакаеш аднаго, а адбываецца зусім іншае. Не люблю я, папраўдзе, аднастайнасці. Люблю, каб усё кіпела, віравала... У-у-у!

МАТЫЛЬ. Цікава, адкуль пайшла пагалоска пра касьбу?

АСА *(задумалася).* Напэўна, ад каровы.

МАТЫЛЬ. Я пытаўся. Тая не ў курсе.

АСА. Можа прыснілася якой кветцы… Яны ж такія эмацыянальныя, такія чуллівыя… Яшчэ вырашаць на сваёй радзе, што лепш дабраахвотна здацца карове, чымся пайсці пад касу.

МАТЫЛЬ. Карове? Навошта карове?

АСА. А каму яшчэ патрэбны гэтыя лугавыя зёлкі? Сам бачыш: аніякія! Ну, у нас з табою няма падстаў для панікі. Калі што – паляцім на суседні луг.

МАТЫЛЬ. Прабач, пагаворым другім разам.



www.kamunikat.org

АСА. Ведаеш, а давай злятаю ў вёску і пра ўсё даведаюся.
МАТЫЛЬ. А што? Гэта ідэя.
АСА. Пакуль! (*Паляцела.*)

**Карціна 5.**

Заходзіць сонца. Смолка, Рамонак, Медуніца, Званочак і іншыя кветкі сабраліся на сход. Раз-пораз непадалёку мыкае Карова.

СМОЛКА. Больш нікога чакаць не будзем.
ЗВАНОЧАК. І не трэба. Хто хацеў, той прыйшоў.
СМОЛКА. Дарагія паплечнікі і сябры! (*Асеклася*.) Што гэта я? Як з трыбуны. Адным словам, я вас не абрадую: заўтра пачнуць касіць наш луг.
УСЕ РАЗАМ. Луг! Касіць! Заўтра!
МЕДУНІЦА. Не можа быць!
РАМОНАК. Абсурд. Мы ж яшчэ і сілы як след не набралі…
МЕДУНІЦА. І не расцвілі толкам...
РАМОНАК. А ў мінулым годзе, кажуць, наш луг увогуле не касілі.
ЗВАНОЧАК. Бо калгас на ладан дыхаў.
РАМОНАК. Не мог жа ён год канаць – і раптам ўзяцца за касьбу!
СМОЛКА. “Мог”, “не мог”… Дзіцячы нейкі лепет. Такое было і будзе. Мы высахнем на сонцы і ляжам у адзін сухі, мяккі, пахучы стог… Без нас сельская гаспадарка проста не абыдзецца.
РАМОНАК. Што мне да іхняй сельскай гаспадаркі! Я, можа, хачу цвісці і пахнуць.
МЕДУНІЦА. І я.
ІНШЫЯ КВЕТКІ. І мы! І мы!

Усе прыгнечана маўчаць.

МЕДУНІЦА. Ну вось. Луг косяць, а я замуж выйсці не паспела!
РАМОНАК. А я не дапісаў паэму пра мёд...
СМОЛКА. А я не памірылася з Матылём.

Смолка заплакала, Медуніца яе суцяшае.



www.kamunikat.org

МЕДУНІЦА (*Званочку*). А ты, Званок, чаго маўчыш?

ЗВАНОЧАК. А я наступнай вясной зноў вырасту. Усе мы вырасцем зноў.

МЕДУНІЦА. Калі тое будзе…

РАМОНАК. Як уяўлю, што маю... маю тоненькую шыйку… *(Заплюшчыўся.)*

СМОЛКА. Жах!

МЕДУНІЦА (*іранічна*). Ты ж сама гаварыла, што сенам стаць – ганарова, што без нас сельскай гаспадарцы кранты…

СМОЛКА (*узяла сябе ў рукі*). Не мы традыцыі ўстаноўлівалі, не нам іх мяняць. Ну, скосяць… Ну, высахнем… Затое наша жыццё падоўжыцца на цэлую зіму.

РАМОНАК. Што мне іхняя зіма! А, з вашымі сходамі… Лепей бы мяне карова з’ела... *(Махнуў рукой і падаўся прэч.)*

МЕДУНІЦА. Бедны Рамонак! Ён такі далікатны, так схільны да дэпрэсіі...

Званочак кінуўся за Рамонкам.
З’яўляецца задыханы Матыль. На хаду перахоплівае і вяртае Рамонка.

МАТЫЛЬ. Пачакай! Не трэба!

МЕДУНІЦА *(Смолцы).* Што з ім?

МАТЫЛЬ *(Рамонку).* Не ідзі да каровы! *(Усім.)* Не хадзіце! Аса сказала… Сам чуў…

РАМОНАК. Што ты чуў?

МАТЫЛЬ. Што касілка… касілка… паламалася!

РАМОНАК. Не можа быць. Якое шчасце!

Кветкі скачуць і пляскаюць у ладкі.

СМОЛКА, МЕДУНІЦА. Паламалася! Паламалася! Будзем жыць! Ура-а-а!

ЗВАНОЧАК. Манюка гэтая вашая Аса!

МАТЫЛЬ (*сабе*). А што калі Аса... Не, не можа быць. Яна сказала мудрую рэч: жыццё сапраўды зменлівае. Палоска чорная, палоска белая… Галоўнае – перачакаць чорную!

РАМОНАК. Значыць, я дапішу сваю паэму?



www.kamunikat.org

СМОЛКА. А я паспею дарабіць свае справы... і з табой памірыцца… Праўда? *(Лашчыцца да Матыля.)*

Званочак сілком вядзе Асу, тая ўпіраецца і верашчыць.

ЗВАНОЧАК. Палюбуйцеся!
АСА. Пусці, расліна! Я чмялю паскарджуся.
ЗВАНОЧАК. Гэтая аферыстка нас падслухоўвала!
МЕДУНІЦА. Даносчыца…
СМОЛКА. Разлучніца! Што, чмялю хацела дагадзіць? Падслухаць і расказаць, так?
МАТЫЛЬ *(Званочку).* Адпусці яе.
СМОЛКА. Ага, заступаешся...
АСА *(вызваліўшыся).* Я навіну хацела расказаць. І не чмялю, а вам!
СМОЛКА. Уважліва цябе слухаем.
АСА. Гэты луг… Цалкам... Аж да лесу... Увесь наш луг выкупіў фермер.
КАРОВА *(здаля).* Му-у-у…
УСЕ *(разам).* Не можа быць!
АСА. Тэхнікі ў яго – цэлы двор. Сама бачыла.
МАТЫЛЬ. З агню ды ў полымя.
ЗВАНОЧАК (*Матылю*). І ты ёй верыш?
СМОЛКА. За адзін дзень столькі перамен!
РАМОНАК. І што цяпер?

Ледзь ідзе Пчолка з дзвюма поўнымі вядзерцамі. Стала, адпачывае.

ПЧОЛКА. План я сёння перавыканала. *(Выцірае пот.)*
АСА. Давай паднясу, сяброўка. *(Бярэ адно вядзерца, падміргвае ў залу.)* А то мужчыны ў нас нездагадлівыя. *(Разам аддаляюцца.)* Ды наманіла я ім, гэтым зёлкам лёгкаверным... Няхай патузаюцца.

ЗАСЛОНА

# ЛЮБОЎ ЗА ЎСЁ МАЦНЕЙ

П’еса для батлейкі

<u>Дзейныя асобы:</u>

МУЖ
ЖОНКА
АНЁЛ-АХОЎНІК
ЧОРЦІК
СМЕРЦЬ

Верхні ярус. Маладая жонка калыша на руках дзіцятка.

ЖОНКА *(спявае)*. “Люлі, люлі, люлі, дзеткі ўсе паснулі”… Позна ўжо, а таткі нашага няма. На рабоце, мабыць, затрымаўся. Працавіты ён у нас. І ты, сынок, гэткім вырасцеш… “Люлі, люлі, люлі спаць, а я буду калыхаць. Прыйдзе шэранькі ваўчок…”

Ніжні ярус. Мужчына выходзіць з дзвярэй, на якіх напісана “гараж”. Зіма, сыплецца снег.

МУЖ. Цяжкі сёння дзень выдаўся. Ну, нічога, не ўпершыню. Работа ў нас такая. *(Паўза.)* Можа, ў краму зайсці па дарозе? Піўца куплю ды і хлеба заадно, жонка прасіла.

АНЁЛ (*з правага боку).* Лепей без піва абысціся. Галава будзе цяжкай, вочы – мутнымі… Спаць адразу завалішся, з сыночкам не пагуляеш…

ЧОРЦІК (*з левага боку).* Ой, і смачнае ж яно, піва… “Старажытнаае” возьмеш ці “Балтыку” нумар восем. Пеністае, хмельнае… Адну бутэлечку не грэх кульнуць.

МУЖ. Праўду кажаш. Адну, для расслабону толькі – і дадому, у цяпло, да мілай маёй жоначкі.

ЧОРЦІК. Хі-хі! Усё па плану, усё як я хачу! (*Скача ад радасці.)*

www.kamunikat.org

Верхні ярус. Жонка вешае пялёнкі ды распашонкі.

ЖОНКА. Дзе ж ён? Затрымліваецца... Хлеба на вячэру няма, хаця б не забыўся купіць. Мабыць, зноў гэтым півам накачаецца…

АНЁЛ *(збоку).* Не думай кепскага, жанчына!

ЖОНКА. Столькі хлопцаў заляцалася, а я яго чамусьці выбрала. От падабаўся – і ўсё. Сэрцу, кажуць, не загадаеш…

АНЁЛ. Ты ж пакахала яго, і ён да цябе прыкіпеў, а з каханнем вы ўсё пераадолееце. Толькі не трэба сумняцацца. Маліся, кліч Архангела Міхаіла!

ЖОНКА. Забыўся пра нас Бог, неіначай…

Ніжні ярус. Муж выцірае вусы, пагладжвае жывот.
З кішэні курткі відна бутэлька.

МУЖ. От, адразу лепей стала… Зусім другі настрой. Нават зоркі з неба весялей пазіраюць. Да сябрука наведацца, ці што?

ЧОРЦІК *(прыхаваўшыся, сабе).* Здарава! У нас на дзве галавы адна думка!

АНЁЛ *(спяшаючы на дапамогу).* Позна ўжо! Цябе жонка чакае з малым дзіцем, непакоіцца. Ды і сябра твой за дзень стаміўся, спаць кладзецца.

МУЖ *(весела).* А я яму – тук-тук. Хто там? Паштальён Печкін. Толькі не запіску прынёс, а беленькай пляшачку. Я што, дазволіць сабе не магу? Мы з сябруком у адным класе вучыліся, за адной партай сядзелі. Жукоў майскіх лавілі ды дзяўчат палохалі. Пайду!

АНЁЛ *(у залу).* Вы створаны свабоднымі і самі выбіраеце – якой ісці дарогай, служыць дабру ці злу.

Верхні ярус. Жонка горка плача, дзіця таксама заліваецца.

ЖОНКА. А дзіцятачка ж маё… А сыночак... Так цяжка на душы. Каб хаця сіратою табе не застацца…

ЧОРЦІК *(дражніць).* У-у-у! У-у-у! Развяла сырасць. Гэткай бяды – мужык пасля працы ў госці падаўся. Падумаеш, чарку-другую

перакуліць… Дом жа не турма, каб сядзець у ім бязвылазна. *(Спявае.)* “Ой ты жыццё, маркота, жыў бы, каб не лянота…”

Ніжні ярус. Муж улукаткі брыдзе па вуліцы, гараць ліхтары.

МУЖ. Вось і дом відаць. Акно наша свеціцца. Яшчэ б наверх піўца для шліфоўкі – і поўны парадак. *(Спявае).* “Ой, мароз, мароз, не марозь міня…”

АНЁЛ. А мароз сапраўды бярэцца, да касцей прабірае. Сцеражыся, чалавеча!

МУЖ. Перабраў крыху, сам бачу. Ну і што? Я рабацяга, мяне начальства паважае. А што выпіць люблю – такой бяды… Прасплюся – і такі самы.

СМЕРЦЬ *(вызіраючы, Чорціку).* Мой кандыдат.

ЧОРЦІК. Любім мы на гатовенькае прыперціся.

СМЕРЦЬ. Бачу, што стараешся. Прэмію квартальную выпішу.

ЧОРЦІК. Каторы раз абяцаеш: “Прэмію... Прэмію...”

СМЕРЦЬ. Т-сс… Цішэй! *(Паднімае касу.)* Яны ўсе мае – тыя, што меры не знаюць. Дзе гарэліца, там і бяда. Там муж на жонку, сын на бацьку, брат на брата паднімаецца.

ЧОРЦІК. Сам ведаю. Многа каго перасварыў, у турму пасадзіў, на той свет адправіў. А ад цябе нават “дзякуй” не дачакаешся, не тое што прэміі. Звольнюся к чорту! У водпуск пайду! Ці на пенсію!

СМЕРЦЬ *(смяецца).* На пенсію… Ха-ха-ха! Да пенсіі яшчэ дажыць трэба… Я вунь колькі касой махаю – і як маладзенькая. *(Паўза.)* Глядзі, наш, няйначай, скора дуба дасць.

Муж абхапіў ліхтар, потым аб’ехаў. Спрабуе спяваць: “Ой, мароз, мароз…” Нерухома ляжыць. Нідзе ні душы, толькі завывае вецер.

СМЕРЦЬ *(Чорціку).* Хадзем, мы сваю справу зрабілі. *(Абняўшыся, знікаюць.)*

Прыляцеў Анёл, мітусіцца, спрабуе падняць чалавека, а потым кідаецца да жонкі. Тая накідвае цёплую хусту і бяжыць на вуліцу.

ЖОНКА. Родны мой! Я так і ведала, што з табою штось кепскае здарылася. Сэрцам адчувала… *(Паднімае Мужа.)* Цяпер усё добра будзе. Я з табою. *(Вядзе за сабой.)*

Верхні ярус. Муж сядзіць у крэсле з забінтаванымі рукамі.
Жонка корміць яго, як малога.

ЖОНКА. З’еш яшчэ дранічка. Смачненькія… Вось і цудоўна. А зараз з сыночкам пагуляй. *(Садзіць дзіця Мужу на калені, Анёл забаўляе таго бразготкай.)*

ЧОРЦІК *(выглядваючы).* Кідай ты яго, дурніца! Навошта табе гэты калека?

ЖОНКА. Акыш, паганы! *(Праганяе таго ручніком.)*

СМЕРЦЬ *(знізу).* Упусціла!.. Праваронiла!.. *(Рве валасы на галаве.)*

АНЁЛ *(дэкламуе).* Я знаю: між людзей
Любоў за ўсё мацней!

Урачыстая мелодыя К. Орфа з балета “Карміна Бурана”.

ЗАСЛОНА

www.kamunikat.org

# ЯК ЛІСКА ЗАЙЦА АБДУРЫЛА

Сцэнічны жарт для дарослых

Дзейныя асобы:

ЛІСКА РЫЖЫКАВА
ЗАЙ БЯЛЕВІЧ

На палянцы восеньскага лесу мы бачым (у разрэзе) лазовы дамок З а я  Б я л е в і ч а. Гаспадар у добрым гуморы рассеўся ў крэсле і чытае газету «Навіны лесу».

ЗАЙ. Ну, што ў нас новенькага? Так… Мядзведзя выбралі спікерам ляснога парламенту… Даўно пара. Вавёрка стала эстраднай зоркай і развялася з мужам… Ліса шукае працу. *(Углядаецца.)* Не можа быць. Ліса? Хоча быць нянькай для куранят?! Ваўка, інспектара ДАІ, арыштавалі за хабар. Ну, калі іх за гэта арыштоўваць, то мы застанемся без…

Нягучны стук у дзверы (яны адсоўваюцца ўверх, як вароты ў гаражы). Гэта Л і с к а  Р ы ж ы к а в а – з тых, што ў стане вечнай маладосці.

Госці нібыта… *(Вызірае ў акно.)* О не, рыжую я не ўпушчу…

ЛІСКА. Адчыні, калі ласка. Я ж ведаю, што ты дома. Маю адну дужа дзелавую прапанову.

ЗАЙ. Ведаю я, Рыжыкава, твае прапановы. Усё роўна абдурыш.

ЛІСКА. Як кепска ты пра мяне думаеш. А мы з табой у адным класе вучыліся, за адной партай сядзелі…

ЗАЙ. Ну, сядзелі, ну і што? Бо ты на першай парце круцілася, вось цябе на галёрку і пасадзілі. Да мяне. І ты ўвесь час у мяне спісвала.

www.kamunikat.org

ЛІСКА *(убок).* І пяцёрачкі атрымлівала*! (Заю.)* Такая восень золкая… Зноў дождж пачынаецца, футрачка мая намокне… *(Абтрасаецца.)* А з мокрай футрай я падобна на бяздомную кошку.

ЗАЙ. Прабач, Рыжыкава, але я не вінаваты, што ты ніяк жытла сабе не збудуеш. Дарэчы, дзе ты падзела грошы, заробленыя на конкурсах прыгажосці? Ты ж на адным другое месца заняла, наколькі мне вядома.

ЛІСКА. Ой, калі гэта было?! Ты б яшчэ мінулагодні снег успомніў.

ЗАЙ. Дарэчы, пра снег. Я адну рэч заўважыў: прыходзіш ты да мяне выключна з наступленнем халадоў.

ЛІСКА. Гэта проста жорстка – напамінаць мне пра зіму. *(Шморгае носам.)* Дазволь хоць нос пагрэць, Бялевіч.

ЗАЙ. Угаварыла. Але толькі нос, дамовіліся?

Зай крыху паднімае дзверы. Ліса прасунула галаву ў праём і закрыла вочы ад асалоды.

ЛІСКА. Ах, як у цябе хораша, як утульна… Мой нос табе дужа ўдзячны. Добрая ў цябе душа, Бялевіч!

ЗАЙ. Сам ведаю, што добрая.

Уключае прыёмнік, гучыць лірычная мелодыя.

ЛІСКА. А памятаеш, як мы на экскурсію ў пушчу ездзілі ды заблудзіліся там з табою?

ЗАЙ. Зубра спалохаліся…

ЛІСКА. Ты быў проста героем: стаў грудзьмі на маю абарону. Дай я табе за гэта лапу пацісну. *(Трасе Заю лапу.)* А лапу мне пагрэць можна? Адну толькі. Левую ці правую – выбірай.

ЗАЙ. Мабыць, лепей… Сам не ведаю, ад якой меней шкоды. Хай будзе левая.

ЛІСКА. Пашанцавала маёй левай лапе. Вязунчык яна ў мяне. Ты памятаеш, што я ляўша, а? *(Уздыхае.)* А правая крыўдзіцца.

ЗАЙ. Што?

ЛІСКА. Кажу, што правая мая лапка таксама хоча ў цеплыню.

ЗАЙ. Так ты ўся сюды прасочышся.



www.kamunikat.org

ЛІСКА *(убок).* А няўжо ж… Абавязкова. *(Заю.)* Калі адна лапа цёплая, а другая халодная, то можа прыкінуцца запаленне.

ЗАЙ. Хітрасці запаленне, ці што…

ЛІСКА. Не, я сур'ёзна. А ты ведаеш, Бялевіч, дзе ў нас знаходзіцца “трэцяе вока”?

ЗАЙ. Не чуў я пра такое. *(Выключае прыёмнік.)*

ЛІСКА. Вось тут *(паказвае),* прама пасярод лобу.

ЗАЙ. Ну і што?

ЛІСКА *(хіхікае).* А тое, што мае лапкі хочуць быць разам. *(Залезла ў домік з лапамі.)*

ЗАЙ. Эй, Рыжыкава, мы так не дамаўляліся! А ну, вылазь. Вылазь, пакуль я харошы!

ЛІСКА. А хочаш, я табе па лапе пагадаю. Будучыню табе прадкажу.

ЗАЙ. Я і сам усё наперад ведаю. Хутка зіма будзе, а за ёй вясна.

ЛІСКА. Жыццё непрадказальнае, Бялевіч… Давай, давай лапу. *(Разглядае лапу зайца.)* Лінія жыцця ў цябе выразная, доўгая. Доўга жыць будзеш. А лінія розуму… *(Спахапілася.)* І яна ніштаватая. А вось наконт кар'еры не ўпэўнена. Не, здаецца, і кар'еру зробіш.

ЗАЙ. Маніш ты, рыжая.

ЛІСКА. Што ні кажы, а галоўнае – гэта асабістае жыццё. Сам ведаеш, у мяне яно не склалася. З мужам развялася, дзетак бог не даў… А я, між іншым, пірагі ўмею пячы. Не адну шарлотку, як некаторыя. З грыбамі, з яйкамі, з капустаю…

ЗАЙ. Капуста такой парою – дыфіцыт.

ЛІСКА. А чаго я прыйшла? Я і хацела табе прапанаваць: давай створым фірму па продажы капусты.

ЗАЙ. А дзе мы яе возьмем, тую капусту?

ЛІСКА. На полі, дзе. Наладзім нарыхтоўку на зіму.

ЗАЙ. Насушым, ці што?

ЛІСКА. Тэхналогія – мой клопат. А твая справа – зарэгістравацца. У нас тут – у цябе, дакладней – офіс будзе. Улады зусім звар'яцелі: без офісу цяпер ліцэнзію не выдаюць.

ЗАЙ. Ага, падаткі як заплоціш – зубы на паліцу пакладзеш.



www.kamunikat.org

ЛІСКА. Дзіўнае ў мяне становішча, Зай. Пярэдняя частка тулава – у раі, а задняя нібыта ў пекле. Мерзне, бедненькая, пакутуе... Яшчэ б заднюю лапу прыстроіць. Век богу за цябе маліцца буду.

ЗАЙ. Першы раз чую, што ты маліцца ўмееш. *(Задумаўся.)* А якому богу – лісінаму ці зайчынаму?

ЛІСКА. Бог адзін, Бялевіч, гэта я табе аўтарытэтна заяўляю. Ну, а калі ты асцерагаешся авантуры з капустай, то я маю яшчэ адну задуму: давай адкрыем астралагічную школу. *(Крыху пасунулася ў дамок.)*

ЗАЙ. У мяне, Рыжыкава, ад тваіх прапаноў дах едзе. Ты, аказваецца, не толькі хірамантка, але, да таго ж, і астролаг!

ЛІСКА. Мяне, даражэнькі, само жыццё вучыла, і вучыла шмат чаму. Я нават піфагораву матрыцу магу табе скласці.

ЗАЙ *(выціраецца ручніком).* Аж узмакрэў я ад тваіх праектаў.

ЛІСКА. Скажы толькі дакладны год, месяц і дзень тваіх народзінаў.

ЗАЙ. Маю метрыку маці згубіла, калі за ёй сабака гнаўся.

ЛІСКА. І што, зусім не ведаеш? *(Прасунулася ў дамок амаль уся, адно хвост знадворку.)*

ЗАЙ. Прыблізна толькі.

ЛІСКА. Шкада. Астралагічная школа, лічы, накрылася. Адно застаецца...

ЗАЙ. Што?

ЛІСКА *(горача)*. Цяпер гэтым усе займаюцца. Біядабаўкі. Жывыя грошы. Увесь лес вітамінамі засыплем. Пачысцім у звяроў кішэчнікі, нармалізуем абмен, палепшым кроў... *(Азірнуўшыся, ціха.)* Хвосцік, пачакай, ужо мала засталося...

Зай раптам абвяў – страціў прытомнасць. Ліска кінулася яго ратаваць і ўся аказалася ў дамку. Пырскае на яго вадой, расцірае скроні.

Што з табой?

ЗАЙ *(слаба).* Ты знарок... пра кроў... А?

ЛІСКА. Даруй, даражэнькі! Я зусім забылася, што ты не пераносіш гэтага слова... А хочаш, я зраблю табе масаж?

ЗАЙ. Яшчэ і масаж! Хопіць з мяне! Капуста, астралогія, дабаўкі… Дурдом нейкі.

ЛІСКА. Валяр’янка трэба. *(Ўкладвае яго на канапу, сама размясцілася побач.)* А прызнайся, любы, у шостым класе я табе падабалася.

ЗАЙ. І ў шостым, і ў сёмым… Грыўка ў цябе была такая, смешная…

ЛІСКА. Эх, дзе яна, маладосць?… Час ляціць… *(Пафасна.)* Але нават час не ўладны над сапраўднымі пачуццямі.

ЗАЙ *(расчулена).* Дай абніму цябе, рыжая… Што ні кажы, а другой такой у лесе не знойдзеш.

ЛІСКА. Гэта праўда. *(Адсоўваецца, пераходзіць на дзелавы тон.)* Што за камод старасвецкі? Бабулін, ці што? Дзе ты такія бачыў цяпер? І люстра гэтая ні к сялу, ні к гораду. Павесім бра. Фэн-шуй, даражэнькі, трэба паляпшаць.

ЗАЙ. Фэн – што?

ЛІСКА. Як, ты не чуў пра фэн-шуй?! Усе толькі і гавораць: “Фэн-шуй, фэн-шуй”… Усе літаральна на ім памяшаліся. Ты што, кітайскі народ не паважаеш? *(Праходжваецца.)* Шторы закажам сучасныя, на Жданах. З фальбонамі. Званочкаў усходніх навешаем і ладанам усё гэта абкурым. Будзе поўны адпад!

ЗАЙ. Ладанам? Абкурым? О-о-о… *(Зноў абсоўваецца.)*

ЛІСКА. А каб ты не думаў, што ўсё гэта занадта дарага, – сукенку возьмем на пракат.

ЗАЙ *(паднімаецца).* Даруй, а нашто сукенка?

ЛІСКА *(цалуе яго ў лоб.)* На вяселле, разумненькі ты мой. *(У залу.)* Адзін у майго мужа недахоп: даверлівы надта…

Гучыць марш Мендэльсона.

ЗАСЛОНА

# ЯК ЗВЯРЫ ГАЗЕТУ ВЫПУСКАЛІ

Вершаваны фарс для дарослых

Дзейныя асобы:

ВОЖЫК, незадаволены інтэлігент
САРОКА, дзелавая жанчына
ЛІСА, не першай маладосці, але дагледжаная
ВАВЁРКА, юная рамантычная асоба
МЯДЗВЕДЗЬ, начальнік
ВОЎК, "крутаваты" прасцяк
КУРЫЦА, вясковая кабета

**З'ява 1.**

Летні лес. В а в ё р к а гайдаецца на арэлях, В о ж ы к ляжыць у гамаку.

ВАВЁРКА (*узнёсла).*
Я лятаю да аблокаў –
Так высока, так высока…
ВОЖЫК *(дражнячы).*
Я ляжу у гамаку
Пад зязюліна ку-ку…
ВАВЁРКА.
Памаўчыў бы лепей, Вова.
ВОЖЫК.
А у нас свабода слова.
ВАВЁРКА *(злазіць з арэляў).*
Добра ў нас. Прырода ўсё ж.
Праганяе спёку дождж.
Значыць, вырастуць грыбы –
Парасонікі нібы.
І хоць сэрца тут пяе,

www.kamunikat.org

А чагосьці не стае.
ВОЖЫК.
Знаю, з’ехалі бабры –
Кавалеры і майстры.
*(Вылазіць з гамака.)*
Што ім нашы елкі, клёны?
Ірванулі да зялёных.
Як ліса перажыве?
Во, бялугаю раве.

Паказваецца засмучаная Л і с а.

ЛІСА.
І нічога не раву я,
Толькі стрымана сумую.
Плакаць – ведай, дружа наш –
Не дае мне макіяж.
ВОЖЫК.
Што ж, ніхто не маладзее…
ЛІСА. Хуліган!
ВАВЁРКА.
Ды ён дурэе.
ЛІСА.
Хай шуткуе не са мной.
А іначай…
ВОЖЫК. О-ё-ёй…
Напужала! О-го-го!
САРОКА *(прыляцеўшы).*
Вы пра што тут? Пра каго?
ВОЖЫК.
А пра тое, дарагая,
Што праектаў не хапае.
САРОКА.
Што, ёсць спонсары? Цікава.
Для мяне праект – не справа,
Ды з ідэямі праблемы…



www.kamunikat.org

ВОЖЫК.
Сталі думаць кепска ўсе мы.
САРОКА.
Ты ж вялікі публіцыст.
Напішы адкрыты ліст,
Фельетон які… Пра тое,
Што таптаць гатоў святое
Наш галоўны…
ВОЖЫК. Ты цішэй!
Тут, у лесе, шмат вушэй.
САРОКА *(схамянулася).*
Мы забылі пра лісу!
*(Ліса сарвала і разглядвае кветачку.)*
ВОЖЫК.
І куды я панясу
Свой артыкул? Глупства гэта!
САРОКА.
Я прыдумала! Газету
Трэба ў лесе адкрываць.
ВОЖЫК.
Хто, аднак жа, бабкі дасць?
САРОКА.
Ёсць таварыш на прыкмеце.
Доўга марыў аб газеце.

З а я ц у спартыўнай форме робіць крос, звярнуў да купкі звяроў.

ЗАЯЦ.
Што за сходка без мяне?
ВОЖЫК *(усім).*
Хай сарока і пачне.
Бабкі – перш, пасля рэклама,
Штат, і аўтары таксама,
Каб прыстойны выбар быў…
ЗАЯЦ.
А я што вам гаварыў –



www.kamunikat.org

Што свая патрэбна прэса
Пра жыццё, навіны лесу…
ЛІСА *(убок).*
Шустры! Гэтак падгадаць… *(Усім.)*
Будзем штаты набіраць.
САРОКА.
Нам патрэбны: рэпарцёр…
ЗАЯЦ.
Аблячу я мігам бор!
ВОЖЫК *(Зайцу).*
Не спяшай. *(Пералічвае.)*
Карэспандэнт…
Фотамайстар… Кабінет…
ЛІСА.
Сакратарка ў кабінеце…
ВАВЁРКА.
Ой, цікава жыць на свеце!
ВОЖЫК.
Мне дык дзейнічаць цікава.
Дай спярша наладзіць справу.
Сабяром такі тыраж…

Уваходзіць М я д з в е д з ь у добрым касцюме і з папкай.

МЯДЗВЕДЗЬ.
Чый гараж?
ЗАЯЦ.
І бацька наш!
САРОКА.
Мы тут думалі-гадалі,
Штат газеты падбіралі…
МЯДЗВЕДЗЬ.
Справа добрая, сябры.
*(Дастае паперу,каб запісваць.)*
Трэба назва.
ЗАЯЦ. “У бары”.



www.kamunikat.org

МЯДЗВЕДЗЬ. *(Запісвае, раскладвае лісты.)*
Прымітыў у голаў лезе,
Даражэнькі…
ВОЖЫК. “Сёння ў лесе”.
МЯДЗВЕДЗЬ.
Галасуем. *(“За” адзін Вожык.)*
ВОЖЫК. Я адзін.
ЛІСА.
І не новая прытым…
САРОКА.
Вам адкажа кожны звер:
Лепш за ўсё – “Лясны кур’ер”.
МЯДЗВЕДЗЬ.
Ну, твая чарга, вавёрка.
ВАВЁРКА.
Назавём “Лясная зорка”.
ВОЖЫК *(убок).*
Далібог, дзіцячы сад!
МЯДЗВЕДЗЬ.
Прапановам вашым рад.
Кожны вам у лесе скажа:
Моладзь – вось надзея наша.
*(Зайцу)*
Ну, вядзі, Пятровіч, сход!
ЗАЯЦ *(разгублена).*
Я… я… я заўсёды, як народ.
ЛІСА *(шэптам падказвае).*
Пачынай галасаванне,
Хто ў газеце шэфам стане.
ЗАЯЦ.
Падніміце ўверх, хто “за”…

Лес лап, толькі Вожык мнецца. Паказваецца падазрона вясёлы В о ў к у аблавушцы.



www.kamunikat.org

ВОЎК.
Глянь, здаюцца! Чудзяса!
Лапы ўгору – добры знак!
ЗАЯЦ.
Галасуй хутчэй!
ВОЎК. А як?
За каго? Што тут за сход?
Што рашаць прыйшоў народ?
ЗАЯЦ *(убок).*
Покуль ты ўедзеш, брат…
*(Мядзведзю)*
Вы – рэдактар наш.
ЛІСА. Віват!
ВОЖЫК *(скрозь зубы).*
Ты, падліза, памаўчы. *(Убок.)*
Справа ляснула, лічы,
Напачатку…
ВАВЁРКА.
Як заўжды!
ВОЎК.
Не было б другой бяды!
Мне, таварышчы, пляваць,
Хто тут будзе кіраваць.
Я прымусу не люблю –
Што хачу, то і раблю.
Улічыце думку й гэту:
Крама лепей, чым газета!

Воўк пайшоў, напяваючы. Звяры відавочна абвялі, імпэт прапаў, толькі Мядзведзь трымаецца важна.

ВОЖЫК. Я пайду….
ЗАЯЦ.
Не зразумеў:
Рэпарцёр я ўжо ці не?
І пра што я напішу,



www.kamunikat.org

Калі пяткі у душу…
Ой, душа у пяткі…
ЛІСА. Зай,
Лепей далей выбірай.
Штаты неўкамплетаваны…
ВОЖЫК.
Хто адказны сакратар?
САРОКА.
Даражэнькі, і не мар.
Той адказны, хто старанны.
Вырашае шэф абраны.
МЯДЗВЕДЗЬ *(Сароцы).*
Значыць, ты. Пастанавілі.
ВАВЁРКА *(нясмела).*
А пра назву мы забылі.
ВОЖЫК *(асцярожна).*
Сапраўды… А як вам – "Вожык"?
САРОКА.
Калі спонсар дапаможа,
З ім параімся. А ён
*(Ківаючы на Вожыка.)*
Сядзе хай на тэлефон,
Апытанне правядзе,
Чаму лес наш у бядзе.
МЯДЗВЕДЗЬ.
У бядзе? Якой бядзе?
Тут няма бяды нідзе!
І давайце дамаўляцца,
Хто не хоча быць без працы, –
Я за ўсё адказ трымаю,
Я кірунак вызначаю,
Што і як пісаць пра лес.
ЗАЯЦ.
Хто пралез? Куды пралез?
МЯДЗВЕДЗЬ *(Зайцу).*
Ты штаноў не працірай,



www.kamunikat.org

Да жыцця бліжэй будзь, Зай!
ВОЖЫК.
Стойце! Важнае пытанне!
Дзе мы знойдзем памяшканне?
ЛІСА.
А хіба ты не зліняў?
Ты ж заданне атрымаў.
ВОЖЫК *(сабе).*
Адціраюць, прайдзісветы,
Хочуць выперці з газеты.
МЯДЗВЕДЗЬ.
Ну, за працу! Ў помач Бог.
За грамадскі дыялог
Станем дружна, станем разам...
ВОЖЫК *(у залу).*
Во як спеліся, заразы...

**З'ява 2.**

Рэдакцыйнае памяшканне. Навагодняя ёлачка.
Ліса з Вавёркай п'юць каву,
Заяц з Вожыкам гуляюць у шахматы.
Дзверы адчыняе строга апранутая С а р о к а.

САРОКА.
Хто не здаў мне матэр'ялы?
ЛІСА.
Я яшчэ не дапісала.
Дапішу і набяру.
ВОЖЫК *(Зайцу, не бачачы Сарокі).*
Я яму і гавару... *(Сароцы.)*
Будзе заўтра, я ж казаў.
САРОКА.
Хто не ўспеў, той апаздаў.
Хто не здась да чатырох... *(Выходзіць.)*



www.kamunikat.org

ЗАЯЦ *(Вожыку).*
Я ж яшчэ не браўся… Ох!
Што за тэма! Проста жах:
Радыяцыя ў грыбах.
ВАВЁРКА.
Праўда, жах. Пятровіч праў.
ЗАЯЦ.
Я грыбоў не каштаваў –
Болей моркву і капусту…
ЛІСА.
Ў лесе з морквако – не густа,
Дый з курамі – не фантан.
*(Прыхарошваецца.)*
Ў шэфа новенькі "Нісан",
Бачылі? Ну проста клас!
ЗАЯЦ.
Клас-то клас, ды не пар нас.

Званок тэлефона, Ліса бярэ трубку.

ЛІСА *(шэптам, прыкрываючы трубку).*
Воўк.
Нясе штось на мядзведзя.
ЗАЯЦ.
У любога дах паедзе,
Калі столькі ужываць…
ВОЖЫК *(іранічна).*
Асмялеў, япона маць!
ВАВЁРКА.
Хлопцы, ведаць вам пара:
Воўк – ахоўнік у зубра.
ЛІСА *(слухаючы трубку, шэптам).*
Ўспамінае фельетон,
Дзе героем стаўся ён.
ВОЖЫК.
Гэта ў першых нумарах



www.kamunikat.org

Мы былі такімі…
ВАВЁРКА. Жах!
Ужо і слова не сказаць!
ЗАЯЦ.
Могуць нават “заказаць”.
ЛІСА *(у трубку).*
У прыёмную… Так, так.
Калі ласка. *(Кладзе трубку.)*
Вось мудак!
ВОЖЫК.
Ён казаў (я помню гэта):
“Крама лепей, чым газета”.
Не дурны, аднак жа, звер –
Разумею я цяпер.

Чуваць нясмелы стук у дзверы.

ЗАЯЦ. Хтосьці ломіцца.
*(Вавёрцы.)* Зірні.
ВАВЁРКА.
Сам устань і адчыні.
ЗАЯЦ.
Адрываюць ад гульні. *(Адчыняе.)*

Уваходзіць маладая, мажнаватая К у р ы ц а.

КУРЫЦА.
Добры дзень у хату вам.
*(Ставіць на падлогу цяжкія ванзэлкі.)*
Адурэла я ад крам.
Выбар большы тут у вас:
Пойдзе сын у першы клас,
Тое-сёе для дачушкі —
Маладзенькае нясушкі…
Ледзьве ўспомніла: суседка
Перадаць прасіла гэта.



www.kamunikat.org

Курыца дастае з сумкі складзены ліст
і аддае Вавёрцы.

Выбачайце, я пайшла. *(Выходзіць.)*
ЛІСА.
Так і бачна, што з сяла.
І спадніца сэкен хэнд…
ВАВЁРКА *(дастаючы пакет).*
Што мы маем на абед?
ЗАЯЦ *(на лісток).*
Што там?
ВАВЁРКА *(чытае).*
Скарга. Не маню.
На самога старшыню!
Дроў бабулі абяцаў,
Ды пакрыўдзіў і не даў.
ЗАЯЦ.
Ў вёсцы холадна цяпер…
ЛІСА.
Ты б закрыў за ёю дзвер.
ЗАЯЦ.
Я у вас тут што – дзяжурны?
ВАВЁРКА *(Лісе).*
Мне далі раман гламурны,
Дні на два, а то б дала.
ЛІСА.
Ах, даўно я не была
На прыродзе… Там, дзе сена…
ВОЖЫК *(працягваючы).*
Птушкафабрыка…
ЛІСА. Ў геене
Будзеш вогненнай гарэць,
І язык твой а-да-мрэць.
ВОЖЫК *(Вавёрцы).*
Дай зірнуць. Пісьмо аддай!



www.kamunikat.org

ЗАЯЦ.
Марна сілы не губляй –
Наш не дасць. Пісаў і дзед.
Помніш ліст пра сельсавет?
Што туды няздара ўлез,
І ўжо могілкі – як лес,
Паваляліся платы…
ВАВЁРКА.
Быццам сам пабачыў ты.
ЗАЯЦ.
Я збіраўся, ды не змог.
Я збіраўся! Бачыць Бог!
ВОЖЫК.
Бог-то бачыць, не сляпы ён…
Толькі мы падчас такія,
Што і ў пекла не ўзялі б,
Каб не план…
ВАВЁРКА.
Вазьмі лепш грыб. *(Падае.)*
Не абедаўшы сядзіш…
ЗАЯЦ.
Дагуляць хачу я. Кыш!

Зазірае Сарока.

САРОКА.
На лятучку роўна ў тры. *(Пайшла.)*
ЗАЯЦ.
З ёй да трох не гавары…
ЛІСА *(Зайцу).*
Што, прадуў, мой дарагі?
ВАВЁРКА *(пра Сароку).*
У яе бой-фрэнд другі.
ЛІСА.
А дзе спонсар абяцаны?



www.kamunikat.org

ВОЖЫК.
Ў кут падаткамі загнаны.
ЛІСА.
Каб не выбіў шэф з бюджэту…
ЗАЯЦ.
Шэф магёць.
ВОЖЫК *(Зайцу).* А песня спета!
Мат табе! *(Вавёрцы.)* Ну дай грыбок,
Я галодны быцам воўк!

Вавёрка падае сушаны грыб.

Скора зноў камандзіроўка:
Рана ўстань, вакзал, сталоўка…
ВАВЁРКА.
Ездзі, покуль малады.
ЛІСА *(задуменна).*
Маладосць… Гады, гады!..
Помню, лёгкай на пад’ём
Я была, і дзень за днём
Па калгасах калясіла.
Ўсё было: імпэт і сіла…
ВОЖЫК.
І курацiну, вядома,
Валакла зусюль дадому.
ЛІСА.
Затупіш ты, брат, калючкі,
Аб мяне…
ВАВЁРКА.
Ён проста злючка,
Ты да сэрца не бяры.
САРОКА *(з дзвярэй).*
На лятучку, спадары!



www.kamunikat.org

**З’ява 3.**

Важна ідзе Мядзведзь, звяры рассаджваюцца вакол стала, побач з шэфам – Сарока.

МЯДЗВЕДЗЬ. Дажыліся!
*(Грукае папкай аб стол.)*
ЗАЯЦ *(сабе).* Ну дзялы!
МЯДЗВЕДЗЬ *(абурана).*
Не садзяцца за сталы!
Калі гэткі клопат наш,
То як вырасце тыраж?
Зрэжу прэмію, зарплату!
ВОЖЫК *(Зайцу, ціха).*
А мяне, відаць, за краты…
САРОКА.
Дысцыпліна – проста жах!
ВАВЁРКА.
Радыяцыя ў грыбах!
МЯДЗВЕДЗЬ.
Што? Я трохі не дачуў…
Як дагодзіш чытачу,
Калі шахматы ды кава
І стаіць на месцы справа?!
*(Абводзіць усіх грозным паглядам.)*
За работу, лайдакі!
ВОЖЫК *(ціха).*
Наваяем на вякі.
МЯДЗВЕДЗЬ. Што?
ВОЖЫК.
Я гэта… проста так.
МЯДЗВЕДЗЬ.
Адбрахацца ты мастак,
Ведаю… *(Лісе.)* А вас прашу…
ЛІСА *(убок).*
Можа, сёння саграшу.



www.kamunikat.org

Ліса засталася ў кабінеце шэфа, адтуль даносіцца яе залівісты смех. Усе вяртаюцца на свае месцы. Сарока з паперамі кудысь пабегла. Вавёрка разбірае пошту.

ВАВЁРКА.
Што нам пішуць?
ВОЖЫК.
Зноў пра дровы?
ВАВЁРКА.
Не, закрылі клуб чарговы…
А яшчэ злучылі – клас! –
Птушкафабрыку й калгас!
Замалёўкі… Абразкі…
Надрукуем мякі.
А паэтаў – як смяцця!..
ВОЖЫК.
Уцякаюць ад жыцця
Ў мары ўласныя, у мроі…
ВАВЁРКА.
Ты ды я, ды мы з табою,
Тры бярозкі, два кусты –
Ўся тэматыка. Кранты.
ЗАЯЦ.
Нам бы крытыка у штат…
ВАВЁРКА.
Каб здурнеў ад вершанят?
ВОЖЫК.
Ой, газета, глас народа…
ВАВЁРКА. Памаўчаў бы.
Што за мода!
ЗАЯЦ.
Лесапілкі у бары…
ВОЖЫК.
Сумна штосьці, спадары…

ЗАСЛОНА



www.kamunikat.org

# СТАРЫ КАЖУХ

(Абразок паводле “Казак жыцця” Якуба Коласа)

Дзейнічаюць:

ДЗЕД АНІСІМ
УНУЧКА
1-ы ХЛОПЕЦ
2-і ХЛОПЕЦ
ВЯСНА
ВЯДУЧЫ

ВЯДУЧЫ. Калі вы скажаце, што гэта не праўда, а байка, дык я запытаюся: а дзе тая мяжа, што аддзяляе праўду ад выдумкі? І ці не бывае так, што выдумка ходзіць за праўду, а чыстую праўду лічаць выдумкай? А калі так, то прашу слухаць уважна.

Дзед Анісім на прызбе ў старым, латаным-пералатаным кажусе. За яго спіной – такая ж старая, перакошаная хата. Ціўкаюць птушкі, лезуць калівы з глебы – вясна ў разгары.

ВЯДУЧЫ. Хто ведаў дзеда Анісіма, той ведаў і яго паношаны кажух. Ніколі ён з ім не расставаўся – ні летам, ні зімою. Такі ўжо быў звычай у старога Анісіма. Мужыкі жартавалі з гэтага кажуха, дзеці дзівіліся, тыцкалі пальцамі, а дзед і вухам не вёў.

ДЗЕД (*сабе*). Зноў мой кажух падраўся. Цікава, а якога ён быў колеру? Ці то белага, ці то чырвонага? Сам не памятаю. Зашыю адну дзірку – у другім месцы разлазіцца. А сонца прыпякае, халера... (*Зняў шапку*.)

Ідзе  У н у ч к а.

УНУЧКА. Дзядуля, табе мама аладак прыслала. (*Падае міску*.)



www.kamunikat.org

ДЗЕД. Прыслала, то добра. Пастаў. (*Унучка ставіць міску на прызбу*.)

УНУЧКА. Мама сказала цябе накарміць і ў хаце падмесці.

ДЗЕД. А? Куды адвесці?

УНУЧКА. Дзедка, ты добра чуеш, ой добра! Дзе твая мятла?

ДЗЕД. Мая мятла з дому сышла, мой савок збег у лясок.

УНУЧКА. Пайду пашукаю. (*Пайшла ў хату і хутка вярнулася*.) А яшчэ мама намовіла, каб ты ў лёгкае пераапрануўся, а я каб прасачыла. Давай, пераапранайся.

ДЗЕД. Ох, ох, спіна баліць... Сярэдзіна ные... Плячо круціць...

УНУЧКА. Хітры ты, дзядуля.

ДЗЕД. Жыццё ўсяму навучыць, унучачка. І хітрым быць, і злосным, і ліслівым...

УНУЧКА. Чакай... (*Пабегла ў хату і вярнулася з белай кашуляй*.) Во, апрані.

ДЗЕД. А? Апрану, а як жа. Як аладкі з'ем. А ты бяжы сабе, бяжы...

УНУЧКА. Не пайду, пакуль не надзенеш. Праз цябе з мяне дзеці на вуліцы смяюцца.

ДЗЕД. Смяюцца? То ж не кепска. Кепска, калі плачуць... Маме скажы дзякуй. Бяжы.

Унучка пайшла. Дзед разглядае прынесеную кашулю,
быццам думае – надзець ці не.
Ідуць два х л о п ц ы.

1-ы ХЛОПЕЦ (*2-му*). Паглядзі на дзеда. Ну як пудзіла ў гэтым кажусе. Хоць на агарод стаў!

ДЗЕД. А? Якое пудзіла? Які агарод? Ото як задам табе, галадранцу! (*Размахвае кульбай*.)

2-і ХЛОПЕЦ. Не гарачыся, дзед! Мы кажам: ці не пара табе кажух памяняць.

ДЗЕД. Не ваша справа! Мой кажух – мне і насіць. Такіх ва ўсёй ваколіцы няма.

1-ы ХЛОПЕЦ (*з іроніяй*). Што няма, то няма. Твая праўда!

ДЗЕД (*бурклівa*). Ведаю я цяперашнюю моду. Зробяць стрынгаля і бегай, як кот з апечаным задам...



www.kamunikat.org

1-ы ХЛОПЕЦ (*2-ому*). Яшчэ заразу якую развядзе... Кажуць, у яго прусакоў – поўная хата.

2-і ХЛОПЕЦ. І чаму людзі так старое любяць, аджыўшае?

1-ы ХЛОПЕЦ. Бо новага баяцца.

Хлопцы адышліся, шэпчуцца.

1-ы ХЛОПЕЦ. А давай украдзем дзедаў кажух ды спалім.

2-і ХЛОПЕЦ. Як ты яго ўкрадзеш?

1-ы ХЛОПЕЦ. А так. Як засне, мы ціха падкрадземся, злаўчымся – і сцягнем.

2-і ХЛОПЕЦ. Згодзен.

1-ы ХЛОПЕЦ. Дай пяць! (*Цісне руку таварыша*.)

ВЯДУЧЫ. Выбралі хлопцы зручную часіну і завіталі неяк у дзедаву хату. Дзед Анісім моцна спаў на палацях – адпачываў пасля абеду. Але апраткі не зняў. Так шанаваў ён свой кажух, так з ім зжыўся.

Чуваць храп дзеда.

2-і ХЛОПЕЦ. Во дзіва: ён і спіць апрануты!

1-ы ХЛОПЕЦ. Паспрабуй цяпер зняць...

2-і ХЛОПЕЦ. А мы паціхеньку. (*Асцярожна здымае з дзеда папружку*.)

1-ы ХЛОПЕЦ. Хаця б не прачнуўся...

2-і ХЛОПЕЦ. Паднімецца дзед, а яго старой апраткі як не было!

1-ы ХЛОПЕЦ. Уяўляю: што пачнецца!.. (*Смяюцца.*)

ДЗЕД (*прачнуўшыся*). А? Хто тут? (*Усхапіўся*.) Людзі, ратуйце! Злодзеі! (*Агледзеўся*.) А, гэта вы, гіцалі! Абармоты! А во вам!

Дзед замахваецца кульбай, хлопцы са смехам разбягаюцца.
Дзед гоніцца следам.

ВЯДУЧЫ. Толькі і паспелі хлопцы, што адзін рукаў адарваць. Бяда ў Анісіма: замахнулася моладзь на самае святое! Няўжо дзед задумаецца, няўжо паслухае людзей?



www.kamunikat.org

Дзед сядзіць ля хаты ў кажусе без аднаго рукава,
прамень асвятляе яго сагнутую постаць.

ДЗЕД. Лёгка ім гаварыць: "Купі новы". Прыдбай на базары новую аўчыну – раз. Знайдзі краўца, і не абы-якога – два. Гузікі, зноў жа... Тры. Прымеркі. А яшчэ як не падыдзе... Як фасон не спадабаецца... А тады бойся, каб не ўкралі. Не, адзін клопат з гэтымі абновамі. А тут – сваё, звыклае, роднае можна сказаць! Даражэнькі мой кажушок! Верны мой таварыш і спадарожнік!

Ідзе дзяўчына ў вышытай вопратцы, з доўгай касою.
Гэта В я с н а.

ВЯСНА. Дзень добры, дзед Анісім!

ДЗЕД. Ды які ён добры! Во, рукаў адарвалі гіцалі. (*Прыгледзеўся.*) А ты чыя будзеш?

ВЯСНА. І не сястра нікому, і не дачка, але ўсім людзям мілая.

ДЗЕД. А? Чамусь я раней цябе не бачыў.

ВЯСНА. Бо пад ногі глядзіш толькі. (*Паўза.*) Табе, дзядуля, не горача?

ДЗЕД. Скажаш яшчэ – горача! З дня на дзень пахаладнее. Замаразкі пачнуцца.

ВЯСНА. І пачнуцца, як зімовую вопратку не здымеш. Ты ж лета пужаеш!

ДЗЕД. Ага, напужаеш яго... Кожны год у час прыходзіць.

ВЯСНА. Ты купіў бы сабе новую апратку, дзядуля. Латаны-пералатаны твой кажух, жывога месца не засталося.

ДЗЕД. І ты пра тое ж! Ідзі, красуня, сваёй дарогай, а мне трэба за справу брацца.

ВЯСНА. Не буду замінаць табе. Але напомню: пакуль ад старога не збавішся – новае не прыйдзе.

ДЗЕД (*задумаўся*). Як гэта?

ВЯСНА. А так. Месца для новага не будзе. Занятае яно. Ну, бывай, дзядуля! (*Адыходзіць.*)

ДЗЕД. Як завуць, дзяўчына?

ВЯСНА (*зводдаль*). Вясна! Вясна мяне завуць.



www.kamunikat.org

ДЗЕД. А? Якая вясна? У нашай вёсцы такіх няма. (*Разглядае кажух*.) Ай-яй-яй... Як згаварыліся ўсе! І чаго прысталі? Чаго ад мяне, старога, хочуць?

Выходзяць Вядучы і хлопцы.

ВЯДУЧЫ. Час няможна ашукаць,
Ён мудрэй за нас усіх.
Чым баяцца і дрыжаць –
Адкрывайце зрок і слых.

1-ы ХЛОПЕЦ. Дзед упарты, як бязмен,
Над старым трасецца.
2-гі ХЛОПЕЦ. Хто баіцца перамен,
З таго люд смяецца.

ЗАСЛОНА

www.kamunikat.org

# ТОТА, ЛЯПА І ПАНУРА*

Жартоўная сцэнка для дарослых

<u>Дзейныя асобы:</u>

ТОТА, воўк
ПАНУРА, авечка
ЛЯПА, гаспадар
ХЛОПЦЫ-КАЛЯДОЎШЧЫКІ

Зіма. Вясковы падворак. Т о т а грукае ў вароты, стараецца быць ветлівым.

ТОТА.
Гэй! Прашу вас адчыніць!
Я не есці і не піць –
Справу маю, не жабрак.
(Чакае.) Хтосьці грукнуў. Добры знак.

Паблізу гаўкае, аж заліваецца сабака.

Маўчаў бы, псіна, покуль жыў.
Я недарэмна зуб тачыў.
Адчыніце! Лепей будзе!
Дык ці ёсць у хаце людзі?!

Вароты адчыняе Л я п а ў кажусе.

ЛЯПА.
Што за шум, а дракі нету?
Не пускаем без білета.

* Персанажы старажытнай казкі, запісанай ад дзеда А. Наўчанковай (г. Клецк)



www.kamunikat.org

ТОТА.
Тут жа, дзядзька, не кіно.
ЛЯПА.
Панімаю. Знаю. Но…
ТОТА.
Кінем жарцікі, стары.
ЛЯПА (*змяняе тон*).
Што за справа? Гавары.
ТОТА.
Час калядны, шуры-муры…
Карацей – я да Пануры.
ЛЯПА.
У цябе губа не дура…
Дзеўка відная – Панура. (*Прыглядаецца*.)
Станька, брат, у поўны рост…
Ды ў цябе з-пад курткі – хвост!
ТОТА (*запраўляючы хвост у штаны*).
Кожны фішку сваю мае.
Ён мне, хвост, не замінае.
ЛЯПА.
А Панура легла спаць.
Позні час…
ТОТА. Павіншаваць
Я прыйшоў авечку вашу.
ЛЯПА. Ты ёй хто?
(*Убок.*) І што ён скажа?
ТОТА.
Я зямляк ёй, не маню.
Добра знаў яе радню.
Праўда, з ёй мы рознай веры…
Адчыняй вароты, дзверы,
Бо Каляды ёсць Каляды…
ЛЯПА.
Што ж, калі ўжо гэтак нада…
(*Накіроўваецца ў глыб двара, убок*.)
Чым пускаць яго ў двор,

Лепш яе паклікаць. Мор
І патоп на вас, нахабаў…
Падурнелі, мабыць, бабы,
Калі з гэтакім – амуры…
Ну й авечка ты, Панура!

Выходзіць П а н у р а ў ладненькім паўшубку.

ПАНУРА.
Добры вечар. Гэта ты?
ТОТА.
Пэўна ж, я, не дух святы.
Вось, прыйшоў, мая красуня.
Можа, мы бліжэй да пуні?
(*Спрабуе абняць.*)
ПАНУРА.
Лепей шчупальцы прыняць.
Я паненка, а не…
ТОТА.
Выбачай, што я ў кар'ер…
ПАНУРА (*дабрадушна*).
Атрымаеш у каўнер,
Папярэджваю. Вось так.
ТОТА (*убок*).
Не злуецца. Добры знак.
(Авечцы.)
Я здалёку, цяпнуў гора.
А цябе пабачыў – змору
Як рукой уміг зняло.
ПАНУРА.
Пойдзем лепей на сяло.
Чуеш, песня як звініць?
(*Даносіцца каладная песня.*)
ТОТА.
Ты ж паспела сон прысніць.
Пра каго, дарэчы, сон?



www.kamunikat.org

ПАНУРА (*у тон*).
Сніла: ў вёску едзе  ё н –
У прыкідзе, на аўто…
ТОТА (*іранічна*).
Можа, з норкавым манто?
ПАНУРА. Ай, маўчы, бо сон нязбытны…
ТОТА (*у залу*).
О, наіў парнакапытны!
Ім дарункі падавай,
Потым – ЗАГС і каравай.
Вузка мысліш ты, Панура.
Паглядзела б з верхатуры
На жыццё. Які прагрэс!
Будзе ў нас свая АЭС.
Ажыве й куток глухі,
З падворкаў знікнуць лапухі,
І гаспадаркай «Светлы пуць»
Мясціну нашу назавуць.
Мы здзівім свет!
ПАНУРА.
Ужо здзівілі.
ТОТА (*мяняе тэму*).
Мы, выпадкам, не прастылі?
Гэткі вецер. (*Паказвае на пуню*.)
Там зацішней.
ПАНУРА (*убок*).
Ухажор такі увішны –
На хаду падковы рве… (*Ваўку.*)
Шчас як дам па галаве!

Між тым гаспадар з-за вугла падслухоўвае.

ТОТА.
Во дзявочая удзячнасць!
Не пачуцці – толькі бачнасць,
Толькі выгада, разлік…



www.kamunikat.org

ПАНУРА.
Мо здалося? Бачу клык.
ТОТА.
Меркантыльнасць – во бяда!
А паглядзіш – галата.
Рушнічок адзін ад мамкі,
А туды ж – адразу ў дамкі.
ПАНУРА.
Ой, звяліся кавалеры…
Дзе сур'ёзныя намеры?
Дзе шляхетнасць? Божа мой!

Песня чуецца бліжэй.

ТОТА.
Калядоўшчыкі з казой!
Пачакай хвілінак пяць.
Я хутка. (*Выбягае з двара*.)
ЛЯПА (*набліжаецца*).
Раю не чакаць.
Тут, дзеўка, воўчыя клыкі…
ПАНУРА.
А сам ты з жонкаю які?
Ні ёй увагі, ні пяшчоты,
Адна – гары яна – работа.
Як зазлуеш, раскрыеш зяпу…
ТОТА (*вярнуўшыся*).
Можа, сватам будзеш, Ляпа?
Цябе я усур'ёз прашу.
(*Убок.*) Інакш я некім закушу.
(*Паказвае клунак*.)
Глядзіце: маем пачастунак.
Смакоцця колькі!
(*Прыкідвае вагу*.)
Важкі клунак…



www.kamunikat.org

ЛЯПА.
У калядоўшчыкаў забраў!
ТОТА (*з пагрозай*).
Табе ў пасцельку не пара?
(*Авечцы.*) Лічу, нам час перакусіць.
Без падмацунку не пражыць.
ЛЯПА.
Дык я таго... Пайду скарэй...
Как гаварыцца, дзень мудрэй...
ТОТА.
Чакай, пакуль ты не пайшоў –
Здымі-ка, браце, кажушок.
Ён нам спатрэбіцца... Пазней...
Бо халадае...
(*Дастае з клунка пляшку*.)

Ляпа пакорна аддаў кажух і падаўся ў хату.

ПАНУРА (*убок*).
У мяне
Былі і хлопцы, і раманы...
Адзін – цяльпук, другі – рахманы,
А гэты – Божа барані!
(*Ваўку.*) З гарла ды белую? Ні-ні!
Я лепей чаркі прынясу. (*Пайшла*.)
ТОТА.
Ўпалюю гэтую лісу!
Ну, пакапрызіла крыху,
Дык я цярплівы. Я магу
Узяць дурнічку у аблогу –
І абдуру. Бывай, нябога!
(*У залу*.)
Жыццё – азарт і барацьба.
Хто перамог, таго кляцьба
Не вельмі напужае.
Ідзі хутчэй, мая малая...



www.kamunikat.org

(*Патупвае, накідвае кажух на галаву*.)
Куды прапала ты, аўца?
Хачу каўбаскі і сальца,
Хачу мілосці ў ноч святую,
Іначай хлопчыкам звякую… (Хіхікае.)
А месяц, месячык які!
Мае, я знаю, сябрукі
Даўно таго… (*Шчоўкае па гарляку*.)
На сон схіліла… (*Пазяхае*.)

Тота ўладкаваўся на лаўцы і заснуў, накрыўшыся з галавою кажухом.

ПАНУРА (*выглядвае з-за ганку*).
Такую долю я не сніла.

Панура адчыніла вароты, знакамі падзывае хлопцаў-калядоўшчыкаў. Паказвае на ваўка.

Яго падалей ад мяне.
1-ы ХЛОПЕЦ.
Дык ён жанаты, кажуць…
2-і ХЛОПЕЦ. Не.
1-ы ХЛОПЕЦ.
Не траціць часу, зух, дарма!
ПАНУРА.
Хіба ў мяне вачэй няма…
А гэта вашая прапажа.
*(Перадае знаёмы клунак.)*
2-і ХЛОПЕЦ.
Ды не прапажа – проста лажа!
1-ы ХЛОПЕЦ.
Звязем ад дзевак і ад хат.

Хлопцы спрытна звязваюць ваўка вяроўкай.



www.kamunikat.org

2-і Хлопец.
Як кажуць немцы, абгэмахт!
ПАНУРА.
Ды не забудзьце развязаць!
ТОТА (*прахапіўшыся*).
Ну, хлопцы, вам не здабраваць!
Паклічу братаноў сваіх!
2-і ХЛОПЕЦ.
Управа будзе і на іх…

Хлопцы панеслі ваўка за вароты.

ЛЯПА (*выходзячы*).
Усё магло быць горш намнога,
Ды абышлося, дзякуй Богу!
Мы знаем гэты маньякоў!
(*Разам з авечкай*.)
А хто з намі, будзь здароў!

ЗАСЛОНА

www.kamunikat.org



# *П’есы для дзяцей*

www.kamunikat.org

# ЗБАН

Сцэнічны абразок для батлейкі
(паводле “Казак жыцця” Якуба Коласа)

Дзейнічаюць:

ЮРКА
ЦЁТКА ТЭРЭСА
БАЦЬКА
МАЧАХА
ДВА АНЁЛЫ
ТВАРЭЦ
МАЦІ (голасам)
ВЯДУЧЫ

ВЯДУЧЫ. На зялёным грудку, дзе рос сівец, стаяла Хвоя. Хіба толькі той не любаваўся ёю, хто пазіраў больш уніз, як угору. Адзінота налажыла на яе след сумнай задумы, і прыгожая Хвоя заўсёды сумавала. Аб чым? Трудна сказаць. І толькі зрэдку, на ўсходзе сонейка, ад яе патыхала ціхай ласкай і радасцю. Да яе не раз прыходзіў малы Юрка.

Да адзінокай хвойкі падыходзіць Ю р к а.

ЮРКА. Была ў мяне мамка, ды захварэла цяжка. Перш ляжала дома, пасля ў царкве, а потым панеслі яе кудысьці... І дзе яна цяпер? Скажы, хвойка! (*Паўза.*) Не кажа... Мабыць, не ведае.

Паказваецца Ц ё т к а Т э р э с а.

ЦЁТКА ТЭРЭСА (*кліча*). Юрка!.. Юрка!..

ЮРКА. Цётачка Тэрэса ідзе!

ЦЁТКА ТЭРЭСА. І куды ты падзеўся, Юрка? Вочы прагледзела, а цябе няма і няма. Што ты тут робіш?

www.kamunikat.org

ЮРКА. З хвойкай размаўляю. Добра тут. Сонейка, матылькі лятаюць...

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Малым дзецям нельга адыходзіцца гэтак далёка.

ЮРКА. Я не малы. (*Сумна.*) Цётачка Тэрэса, скажыце, а куды падзелася мая мама? Чаму яе няма?

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Твая мама пайшла далёка-далёка, але скора вернецца. З гасцінцам для цябе.

ЮРКА. Праўда?

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Праўда, праўда… А калі ты будзеш плакаць, то яна можа табе гасцінец і не аддаць.

ЮРКА. Не буду болей плакаць. Буду мамку чакаць з гасцінцам. (*Скача ад радасці, потым задумваецца.*) А ў які бок пайшла мая мама?

ЦЁТКА ТЭРЭСА (*паказвае*). А за гэты ўзгорак, дзе хвойка расце. Хадзем дадому, хлопчык.

ВЯДУЧЫ. Нярадаснымі былі дзіцячыя гады сіраты. І калі надараліся светлыя хвіліны, то за іх ён павінен сказаць дзякуй цётачцы Тэрэсе.

У хату да Цёткі Тэрэсы заходзіць Юрка.
У куце вісіць абраз Божай Маці.

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Ідзі сюды, Юрка, пашкадую цябе… (*Абняла*.) Зноў да хвойкі наведваўся?

ЮРКА. Я там трошачкі пабыў. Трошкі-трошкі!

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Хадзі, дзеткі, да стала. Выпі малачка, каток.

ЮРКА. Я не каток, я хлопчык.

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Сірацінка мая гаротная... (*Абдымае яго*.) Навіна ёсць, Юрка.

ЮРКА. Якая навіна?

ЦЁТКА ТЭРЭСА. У цябе зноў будзе мама.

ЮРКА. Вернецца, так? З гасцінцам? (*Радуецца*.)

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Другая ў цябе будзе мама, дурненькі. Новая.

ЮРКА. Не хачу я чужой мамы! Я сваю чакаць буду.

Цётка выцірае фартухом вочы.



www.kamunikat.org

У хаце Юркі. Стол з бутэлькамі і караваем. За сталом Б а ц ь к а з пышнай маладзіцай, перад імі стаіць пануры Юрка. Чуваць галасы гасцей.

БАЦЬКА. Вяселле ў нас, Юрка. Садзіся, госцем будзеш.

Юрка не скрануўся з месца. Бацька працягвае яму шклянку.

На, хлабысні.

ЮРКА (*пакаштаваўшы*). Горкая і смярдзючая. Я гэта піць не буду.

БАЦЬКА (*смяецца*). Што ты разумееш, малеча!

МАЧАХА. Падрасце – рассмакуецца…

БАЦЬКА (*Юрку*). Ну, пакажы, дзе твая мама?

ЮРКА. Мая мама па гасцінец пайшла і хутка вернецца.

БАЦЬКА (*паказвае на Мачаху*). Вось твая мама!

ЮРКА. Гэта не мама, а Параска Дзяцел, наша суседка.

БАЦЬКА. Не заві яе больш Параскай. Мамай заві! А то папружкі паспытаеш.

МАЧАХА. Бачыш, неслух які… Упоперак бацьку становіцца…

БАЦЬКА. Нічога, я яго навучу. Вось табе, вось! (*Ганяецца за сынам з папружкай.*)

ЮРКА. Параска яна, Параска, а не мама мая!.. (*Уцякае.*)

ВЯДУЧЫ. Так і рос ён – нялюбым, закінутым хлопчыкам, без ласкі і прывету. Бывае, і пакарміць яго забывалі. Падаўся неяк Юрка ў каморку.

У каморцы. На сцяне вісіць кумпяк. На паліцах – збанкі і кашолкі.

ЮРКА. Цёмна тут, як у склепе. Мышы скрабуцца… Што б гэта з’есці, пакуль нікога дома няма? А, ведаю! Тут стаяў збан з малаком. Адап’ю крышачку, ніхто і не заўважыць. Дзе ён, той збанок?

Юрка шукаў, шукаў збан, а потым незнарок скінуў яго з паліцы. Збан разбіўся.



www.kamunikat.org

ЮРКА (*паднімаючы чарапкі*). Авой, разбіўся! І не хацеў, а шкоду зрабіў! Цяпер біць мяне будуць, у кут паставяць… Лепей зусім не выходзіць з гэтай каморкі. Пакуль агледзяцца…

Юрка кладзецца на паліцу і засынае.

ВЯДУЧЫ. І сніцца хлопчыку незвычайны сон, нібыта на небе хочуць разабрацца – вінаваты Юрка ці не.

**Сон Юркі.**

А н ё л ы трубяць у трубы. Мудры Т в а р э ц па лесвіцы сыходзіць на зямлю. Мачаха стаіць з папружкай.
Юрка сцяўся і чакае пакарання, са страху закрыў твар рукамі.
За ўсім назіраюць Цётка Тэрэса і два а н ё л ы – перажываюць за хлопчыка.

ЮРКА. Што цяпер са мной будзе?..

ГОЛАС МАЦІ. Не бойся, сынку, я з табою!

МАЧАХА (*Тварцу*). Неслух ён, Божа! Робіць абы-што, лазіць абы-дзе. Бачыш, збан растоўк, ды яшчэ з малаком!

ТВАРЭЦ. Збан разбіў? З малаком? Ай-яй-яй…

ГОЛАС МАЦІ. Не хацеў ён! Незнарок разбіў, бо згаладаўся.

ТВАРЭЦ (*урачыста*). А мы зараз праверым, ці вінаваты гэты хлопчык. (*Мачасе.*) Параска, нясі сюды цэлы збан.

Мачаха тарабаніць вялізны збан.

Калі ён сапраўды вінаваты – застанецца ў гэтым збане, калі невінаваты – вылезе з яго.

Тварэц кідае Юрку ў збан. Анёлы спалохана ахнулі.

ЦЁТКА ТЭРЭСА. Бедны хлопчык!

МАЧАХА. Так яму і трэба.

1-ы АНЁЛ (*лётаючы, зазірае ў збан*). Глыбака… Мабыць, не вылезе.

2-і АНЁЛ. Думаю, выберацца. Паглядзіш, выберацца!
ТВАРЭЦ. Не замінайце, служкі мае нябесныя!
ЦЁТКА ТЭРЭСА. Хоць бы выбраўся… (Ціха *плача*.)
ГОЛАС МАЦІ. Не здавайся, дзіцятка маё! Я з табою!

Гучыць чуллівая мелодыя трубы. Усе напружана чакаюць.
Раптам са збану на крылцах вылятае Юрка.
Усеагульны ўздых палёгкі.

ЮРКА. Не вінаваты я!
АНЁЛЫ. Не вінаваты!
ГОЛАС МАЦІ. Не вінаваты!
ЦЁТКА ТЭРЭСА. Дзякуй Богу, апраўдалі!

Юрка скача на краёчку збана. Анёлы абдымаюцца ад радасці.
Тварэц з усмешкай закрывае заслону.

ЗАСЛОНА.

www.kamunikat.org

# ЯК ПТУШКІ ДУБ РАТАВАЛІ

( З “Казак жыцця” Якуба Коласа)
Сцэнічны абразок

Дзейнічаюць:

ДУБ
САРОКА
СОЙКА
ГАЛКА
КРУМКАЧ
ДЗЯЦЕЛ
БУСЕЛ
БУСЛІХА
ВЯДУЧЫ

ВЯДУЧЫ. Пэўна не скажу, над якою рэчкаю векаваў магутны дуб: ці то над Нёманам, ці то над Свіслаччу. Ды гэта і не мяняе сутнасці справы. Важна тое, што год за годам над дуб навальвалалася старасць.

Лясная паляна. Вакол дуба сабраліся птушкі. С а р о к а гуляе з блішчустым ланцужком. С о й к а прыхарошваецца, Г а л к а шэпчацца з В а р о н а й.

ГАЛКА (*Вароне*). Зірні, з чым наша Сарока гуляе... (*Да Сарокі.*) Дзе ты ўзяла новую цацку?

САРОКА (*загадкава*). Знайшла.

ВАРОНА. Так мы табе і паверылі...

ДУБ (*стогне*). О-ох, о-ох...

ПТУШКІ. Дуб стогне. Што з ім? Што, што, што?

ДУБ. Старасць не радасць… І верхавіна ўжо лысець пачала, і галіны голыя ў небе свецяцца… Ох, жыццё маё гарапашнае…

www.kamunikat.org

САРОКА. Чуеце? Чуеце? Наш дуб старэе! Дуб старэе! Хутка, не тут кажучы, на дол небарака рухне.

СОЙКА. Такі быў магутны, такі моцны, жалудамі нас карміў – і на табе! Засыхае, бедненькі…

ГАЛКА. А як ваяваў з бурамі ды навальніцамі!

САРОКА. Так, так! Мы ўсе пад яго галінамі хаваліся.

Цяжка тупае стары згорблены К р у м к а ч
з таўстою кнігаю пад пахай.

КРУМКАЧ. Ккруп… Ккруп… Ттруп…

САРОКА. Што ён кажа?

ПТУШКІ *(разам).* Што? Што ён сказаў? Труп?

ГАЛКА. А матачкі мае! Гэта ж крумкач варожыць, што скора наш дуб дуба дасць.

СОЙКА. І зусім не гэта хоча сказаць мудры прафесар. Ён проста дае параду, што хвораму дуб для папраўкі трэба круп.

САРОКА. Цішэй вы! Прафесар скажа прамову.

СОЙКА. Не проста прафесар – акадэмік! Пачынайце, шаноўны.

Крумкач выйшаў у цэнтр і акінуў вокам усю птушыную грамаду.

КРУМКАЧ. Ккрак! Усім ясна, паважанае грамадства: наш паважаны дуб цяжка хворы. Галава яго аблысела, а збоку пачало ўтварацца дупло. Трэба даследаваць, у якім стане знаходзіцца сэрцавіна дрэва.

САРОКА. Так, так! Даследаваць!

КРУМКАЧ. Я не ўсё сказаў. (*Пракашляўся.*) Прыйдзецца, шаноўнае птаства, запрасіць на кансультацыю Дзятла.

СОЙКА. Якая мудрая думка!

ПТУШКІ *(разам).* Дзятла! Дзятла! Доктара! Хірурга!

САРОКА. Ціха вы! Дзяцел зараз адпачывае – зрабіў аперацыю хворай сасне.

СОЙКА. Але наш хворы ў цяжкім стане.

КРУМКАЧ. Хто ўстане?

ГАЛКА (*як глухому*). Мы кажам: дуб упадзе і не ўстане.



www.kamunikat.org

КРУМКАЧ. А-а-а...

САРОКА. Ну, калі ўсе так рашылі, трэба клікаць Дзятла. (*Галцы.)* Злётай, Галка, і запрасі далікатненька.

СОЙКА. Лепей я. Я, Сойка, да ўсіх падыход маю.

КРУМКАЧ. Ляціце разам.

САРОКА (*аддаючы свой ланцужок Сойцы*). Гэта доктару, каб не адмовіў.

Д з я ц е л дрэмле ўсваім пакоі. Галка з Сойкай стукаюцца ў дзверы.

ДЗЯЦЕЛ (*прахапіўся).* Хто там?

ГАЛКА. Бяда ў нас, доктар.

ДЗЯЦЕЛ. Вас многа, а я адзін. Пазней прыходзьце. (*Прыадчыніў дзверы.)*

ГАЛКА. Але наш дуб хворы!

СОЙКА *(штурхае яе).* Ды не так! Табе ж сказалі – далікатненька! (*Дзятлу.)* Міленькі ты наш, даруй за клопат. Мы прыляцелі ад імя ўсёй птушынай грамады. Дуб стары, карміцель наш, заняпаў, занядужаў. Слаўны такі быў, ты сам не раз да яго прылятаў. (*Разам.)* Адведай хворага, калі ласка!

ДЗЯЦЕЛ (*думае*). У два візіт, у пяць – таксама...

СОЙКА. Мы ўсе без цябе як без рук. Прымі падаруначак ад нас, птушак. Так, дробязь... (*Перадае ланцужок*.)

ДЗЯЦЕЛ. Добра, адведаю. (*Збірае прылады, адзяе белую шапачку.)*

Дзяцел абстуквае і аглядае Дуб з усіх бакоў.
Птушкі сочаць за кожным яго рухам.

КРУМКАЧ. Ккрум… Ці будзе жыць?

ДЗЯЦЕЛ (*паправіў акуляры і вынес вердыкт).* Дуб сапраўды хворы, але не настолькі, каб можна было трывожыцца за яго жыццё. Патрэбен поўны спакой. Дзіркі пазатыкаць, жалуды пазнімаць, лісты… Не, лісты хутка самі адваляцца. Галоўнае, ад восеньскага ветру посцілкай захутаць.

ПТУШКІ (*разам).* Дзякуем! Дзякуем, дарагі доктар!

КРУМКАЧ. Прыемна ведаць, што ў нашым лесе ёсць такія спецыялісты. *(Пацiскае Дзятлу руку.)*

СОЙКА. Мы вас правядзём, даражэнькі. (*З Сарокай праводзяць яго.)*

КРУМКАЧ. Што ж, будзем лячыць старога. Перш за ўсё абаронім яго ад ветру.

ВАРОНА. Я! Я буду дапамагаць!

ПТУШКІ (*разам*). І я! І я!

Птушкі адзяюць Дубу вязаны каптур і рукавіцы, ахінаюць посцілкай і зверху завязваюць шалікам.

ПТУШКІ. Вось так. Так добра будзе… Цудоўна. Поўны парадак.

ДУБ. Ох, зусім няма чым дыхаць…

САРОКА. Пацярпі. Увесну будзеш як новенькі!

Птушкі, задаволеныя сабою, водзяць вакол дрэва карагод.

ВЯДУЧЫ. Застаецца сказаць нямнога, каб закончыць казку. За зімою, як вядома, ідзе вясна. Вярнуліся з выраю буслы. І што ж яны бачаць?

Ідуць з рукзакамі стомленыя б у с л ы.

БУСЕЛ. Нарэшце мы дома… Вярнуліся. Гняздо падновім, дзетак выведзем…

БУСЛІХА. Авой, зірні, што сталася з нашым дубам! У яго каптур, як у старой бабкі.

БУСЕЛ. Праўду жонка кажаш, сам на сябе непадобны стаў. Збуцвеў, ледзь на нагах трымаецца…

БУСЛІХА. Дык што з нашым домам будзе? Дзе нам жыць цяпер?

КРУМКАЧ. У буслоў праблема з жыллём. Ккрум…

Буслоў акружылі птушкі.

СОЙКА *(буслам).* Ой, мілыя! Зусім наш дуб увосень занядужаў...

ГАЛКА. Аслабеў...

ВАРОНА. Мы так стараліся, так яго лячылі!

САРОКА. Самае дарагое аддалі...

БУСЕЛ (*дражніць*). Стараліся яны… Лячылі… Перастараліся і пералячылі. Давай, жонка, расхутваць будзем дуб.

Буслы знімаюць з Дуба рукавіцы, шапку, посцілку.
Птушкі вакол мітусяцца, крычаць… Дуб удыхнуў паветра
і расправіў грудзі.

ДУБ (*буслам*). Дзякую вам, дзеці мае! Адсланілі вы мне свет белы.

ВЯДУЧЫ (*у залу*). А вось і мараль гэтай гісторыі: усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру.

ЗАСЛОНА

---

Да “Казак жыцця” я звярнулася з нагоды юбілею Якуба Коласа. Пранікнёныя і поўныя жыццёвай мудрасці, яны проста “прасіліся” на сцэну. Пераклаўшы адну з казак на мову драматургіі, я ўпершыню паспрабавала сябе ў ролі рэжысёра. Мае навучэнцы (а я вяла гурток практычнай журналістыкі) таксама займелі новы вопыт – выступалі як акцёры на вялікай вечарыне.

Казка “Як птушкі дуб ратавалі” вучыць нас рабіць дабро, захоўваючы пачуццё меры. Бо і добрую справу, як вядома, можна загубіць, калі брацца за яе без розуму і здаровага сэнсу.

Інсцэніроўка дазваляе задзейнічаць многа выканаўцаў, праявіць фантазію і гумар у падборы касцюмаў і рэквізіту. Яе можна выкарыстаць для любога літаратурнага вечара ці школьнага свята.

У казцы “Збан” адстойваюцца такія чалавечыя рысы, як справядлівасць, міласэрнасць. “Стары кажух” высмейвае боязь перад новым, перад зменамі жыцця.Усе гэтыя невялічкія творы – выразны доказ таго, што нацыянальная класіка заўсёды сучасная.

**Аўтар**



www.kamunikat.org

# ХТО РАШУЧЫ – ТОЙ ГЕРОЙ

Вершаваная п’еса
для дзяцей школьнага ўзросту

<u>Дзейнічаюць:</u>

САРОКА
ЛІСА
МЯДЗВЕДЗЬ
ВОЎК
ВАВЁРКА
ВОЖЫК

**З’ява 1.**

Лясная паляна. Ранняя вясна, цвіце кветка-сон. Дзве шыльды: Бюро “Навіны лесу” і Атэлье “Лясное дзіва”, апошняя крыж-накрыж перакрэслена надпісам “Зачынена”.
С а р о к а размясцілася каля бюро. Непадалёку Л і с а ў доўгай спадніцы прымярае капялюшык перад люстэркам аўтамабіля, прымацаваным да дрэва.

ЛІСА.
Нішто сабе… Я проста краля!
І хто сказаў, што ў бабкі крала
Я куранят? Я іх пасла.
САРОКА.
Ды штось не стала іх пасля.
ЛІСА.
Не ўберагла ад каршуна.
САРОКА *(ўбок).*
Манюка добрая яна…

Тупае М я д з в е д з ь у дублёнцы і аблавушцы.



www.kamunikat.org

МЯДЗВЕДЗЬ.
Дзень добры, рыжая!
(*Сороцы.)* Прывет!
ЛІСА.
Дзень добры, сябра і сусед!
Табе не горача выпадкам?
Ты б зняў кажух.
МЯДЗВЕДЗЬ *(знімае шапку).*
Гарачавата…
Вясна…
Ды вельмі ж угадзіла
Мне атэлье “Лясное дзіва”.
САРОКА *(ўбок).*
І летам будзе ён хварсіць…
ЛІСА *(Мядзведзю).*
Дасі у холад панасіць?
МЯДЗВЕДЗЬ.
Ты б заказала на зіму.
Што за прыколы? Не пайму.

Прыкульгваючы, ідзе пануры В о ў к у красоўках.

САРОКА.
Ой, невясёлы крок ваўчыны…
ВОЎК.
Бо ёсць сур’ёзная прычына.
ЛІСА.
Што, зноўку зайца не дагнаў?
ВОЎК. Ды не.
Я ледзь дакалыпаў
На паляну, вер – не вер.
Во, узяў не той памер!
*(Паказвае на абутак.)*



www.kamunikat.org

ЛІСА.
Чаго не зробіш дзеля моды!
Дзе, дарэчы, бегемоты?
МЯДЗВЕДЗЬ.
Ірванулі за бугор!
ЛІСА.
Нецікавы ім наш бор…
САРОКА.
А я да іх без інтарэсу.
Ёсць бюро “Навіны лесу”,
Працы – мора! Штогадзінна
Нам жыццё нясе навіны.
Абляцець не так і проста
Лес увесь… Каб паспяваць,
Мушу штаты пашыраць.

На апошніх словах прыскакала В а в ё р к а ў шапачцы з кутасом.

ВАВЁРКА *(захоплена).*
Згодна! Ў нас такія шаты!
САРОКА.
Я кажу цяпер пра шта-ты,
Не дачула ты…
ВАВЁРКА.
Шкада…
МЯДЗВЕДЗЬ (*дабрадушна).*
Ой, малая дурата!
ВОЎК *(Сароцы).*
Можа, трэба вартаўнік?
Спаць я ўвогуле адвык,
Буду пільным…
ЛІСА.
Што там красці?!
САРОКА.
Красці можна ўсюды, здрас-сце.
Стос паперы – во такі,



www.kamunikat.org

Кнопкі, скрэпкі, тры цвікі…
ЛІСА.
А цвікі нашто?
САРОКА. Не знаю…
МЯДЗВЕДЗЬ.
Гаспадарка не малая…
САРОКА.
Да таго ж у нас ёсць планы
Ўзяць камп'ютэр патрыманы.
ЛІСА *(іранічна).*
Цуда тэхнікі, дый годзе!
ВАВЁРКА *(хіхікае).*
21-ае стагоддзе!
МЯДЗВЕДЗЬ.
Чымся гэтакі расход,
Лепей дзятла ўзяць на год –
Можа, справішся і так.
САРОКА.
Не скажу, што ён лайдак,
Ды… Я лепш вазьму саву.
Так закруціць галаву,
Што паўлесу аглядзіць.
ЛІСА.
Цэлы дзень, аднак жа, спіць!
САРОКА *(не зважаючы).*
Будзе ў нас навін – тузін!

Прыбягае задыханы З а я ц у камізэльцы.

ЗАЯЦ.
Разбягайцеся! Гарым!
ВАВЁРКА.
Што?! Гарым?
ЛІСА.
Не можа быць…



www.kamunikat.org

МЯДЗВЕДЗЬ.
Лес гарыць?
ЗАЯЦ.
Трава гарыць!
Запалілі два балбесы,
Што гулялі каля лесу.
ЛІСА.
Бегчы, бегчы – і хутчэй,
Покуль пяткі не пячэ.
*(Вавёрцы.)* Згодна?
ВАВЁРКА.
Думаю яшчэ.
САРОКА.
Гінуць мышы і жучкі,
Мурашыныя дамкі…
Што як дрэва запалае?
ЛІСА.
Хопіць каркаць, дарагая!
І ў мінулы год гарэла…
МЯДЗВЕДЗЬ.
Так, а лес застаўся цэлым.
САРОКА.
Мы аб'явім бой агню!
Трэба выбраць старшыню
Весці сход.
ВОЎК.
А дзе народ?
Ўсе па норах – ні гу-гу,
Я нічым не памагу.
ВАВЁРКА.
Чуць такое вельмі горка,
Вельмі крыўдна… Я, вавёрка…
ЛІСА.
Дробным слова не давалі.
ВОЎК.
Можа, скажа наша краля?



www.kamunikat.org

*(Думае.)*
Дзе ў нас вёдры і багры?
САРОКА.
Ўсё прысвоілі бабры,
А на шланзе сам ты спіш.
ВОЎК.
Гаваркая ты... Акыш!
Сплю, бо холадна ў бакі.
Доля злая. Лёс такі.
ВАВЁРКА.
Я хвастом! Нашто вада?
МЯДЗВЕДЗЬ.
Ой, малая дурата!
ЛІСА *(прынюхалася).*
Падбіраецца... О Божа!
Дыму проста не выношу.
Алергія і мігрэнь...
МЯДЗВЕДЗЬ.
Выверну я гэты пень,
І тушыць мы будзем пнём.
ЗАЯЦ.
Разам справімся з агнём!
Ну, пабег далей...
САРОКА. Бяжы.
Ўсім сустрэчным раскажы!

**З’ява 2.**

Заяц, бегучы, ледзь не збіў з ног В о ж ы к а, які валачэ большы за сябе вогнетушыцель.

ВОЖЫК.
Эй, лягчэй на паваротах!
ЗАЯЦ.
Выбачай, мая работа –
Ўсім звярам паведаміць,

Што пажухлы дол гарыць.
*(Пабег.)*
ВОЖЫК.
Што, панове, лясы точым?
САРОКА.
Ды звычайны сход рабочы.
ВОЖЫК.
Бачу, бачу… Ля-ля-ля
Языкамі, а пасля…
Покуль сход у вас кіпіць,
Пачалі канаву рыць
Два дзікі – без лішніх слоў.
ВОЎК.
Дзік капае – будзь здароў!
САРОКА.
Засцілае дымам неба…
МЯДЗВЕДЗЬ.
Пень, гляджу я, без патрэбы.
*(Вожыку)*
За сіфон цябе хвалю.
Я здагадлівых люблю!
ЛІСА.
Невыносная задуха!
Я пайшла.
ВОЖЫК.
Бывай, хітруха!
*(Вавёрцы)*
А цябе, дзіцячы сад,
Ўжо даўно шукае брат.
Збіўся з ног…
МЯДЗВЕДЗЬ.
Бяжы, малая…
ВАВЁРКА.
Вы знарок? Наўмысна? Зна-аю…
ВОЖЫК.
Каб я лопнуў! Не маню!

www.kamunikat.org

ВАВЁРКА.
Мы аб’явім бой агню!
САРОКА.
А на першай паласе
“Ганьба воўку і лісе!”
Загаловак будзе…
ВОЖЫК. Дзе?
Ты б газету перш адкрыла,
А пасля б ужо кляйміла.
ВОЎК *(гледзячы на ногі).*
Гэты чортаў “Адзідас”
Разагнацца мне не дасць:
Лапы прэюць і баляць…
Трэба, мусіць, выкідаць…
*(Скідае красоўкі.)*
Добра, я таксама з вамі…
САРОКА *(адлятаючы).*
Я вярнуся са звярамі.
Сабяру мясцовых птушак,
І агонь як стой патушым.
ВАВЁРКА.
А я вёдры вам знайду.
МЯДЗВЕДЗЬ.
Разам рушым на бяду.
ВОЖЫК.
Адратуем родны лес!
ВОЎК.
Бо пражыць не можам без.
РАЗАМ.
Толькі дружна, толькі ўсе мы
Разам пойдзем на праблему!

Звяры выстройваюцца ў шарэнгу, спераду Вожык
з вогнетушыцелем, замыкае Вавёрка, камандуе Мядзведзь.



www.kamunikat.org

МЯДЗВЕДЗЬ.
Аць, два! Аць, два!
ВАВЁРКА.
За-га-рэ-ла-ся трава.
ВОЖЫК.
Хто рашучы – той герой!
МЯДЗВЕДЗЬ.
Левай! Леваю!

Прыбягае Заяц.

ЗАЯЦ. Адбо-о-ой!
МЯДЗВЕДЗЬ.
Як? Мы дзейнічаць рашылі!
ЗАЯЦ.
Дзеці самі патушылі.
ВОЎК.
Мог красоўкі не скідаць.
ВАВЁРКА *(расчаравана).*
Я ж хацела паспрыяць…
ВОЖЫК.
Шчэ не знаў такога бор:
Быў у нас вучэбны збор!
РАЗАМ.
Толькі дружна, толькі ўсе мы
Разам пойдзем на праблемы!

ЗАСЛОНА

www.kamunikat.org

# КІСКА, НЕ ПАДМАНЕШ!

Міні-п’еса для дзяцей

<u>Дзейнічаюць:</u>

КОШКА-РЫСКА
МЫШ

Каля норкі ў куце пакоя з меланхалічым выглядам,
заплюшчанымі вачамі сядзіць К о ш к а.
На самай справе яна напружаная і ў чаканні здабычы.

КОШКА.
Дык злаўлю ці не злаўлю
Гэта дробнае стварэнне?
Бо канчаецца цярпенне
І затрымкі не люблю.
МЫШ (*выглядваючы з норкі*).
Твая справа – паляваць,
Мая справа – уцякаць.
КОШКА *(пазяхаючы).*
Мае вочкі моцна спяць...
МЫШ.
Не падманеш мяне, кіска.
Ты як тыгра тая – ў рыску.
Як заціхла – кепскі знак...
КОШКА (*абурана*).
Ды сяджу я проста так!
Проста села і драмлю,
Цішыню, спакой люблю.
МЫШ.
Хопіць хітрыкаў, кісуля!
Там, дзе ты, ніякіх гуляў
Не бывае ў мышанят.



www.kamunikat.org

КОШКА *(цікуючы за Мышшу).*
Разумею... Кожны рад
Жыць бяспечна... Я таксама.
“Будзь хітрэй!” – вучыла мама.
“Вуркачы, ля ног патрыся –
Малачка прыбудзе ў місе.”
Вось, сяброўка... Павучыся!
МЫШ.
Хто сяброўка? Я? Аж смех!
Прытварацца, кіса, грэх.
Хто прытвора – той і хлус,
Ненадзейны з ім хаўрус.
Вакол пальца абвядзе...
КОШКА *(шэптам).*
Сцеражыся... Быць бядзе.

Кошка лоўка скокнула – і злавіла Мыш. Тая вырываецца.

МЫШ.
Памажыце! О-ё-ёй!
КОШКА.
Дарагуша,
Я з табой, ты павер,
Не буду злой.
*(Гладзіць Мыш па спінцы.)*
Пагуляю ды пушчу...
МЫШ.
Не жадаю! Не хачу!
КОШКА.
Раскрычалася, нібыта
Рэжуць...
Гэта пераЖытак –
Есці шкуркі... Паўтараю...
МЫШ.
Не хачу і не жа-да-ю!



www.kamunikat.org

КОШКА.
Пачала лемантаваць...
Так расхочацца й гуляць.

Кошка забаўляецца з Мышшу.

Як забаўна: перш схапіць,
Потым крышку адпусціць –
Хваць, і зноў у кіпцюры...
Во якія мы звяры!
*(Мышы.)*
А давай цябе падкіну
І злаўлю. Ты згодна?
МЫШ *(з жахам)*.
Гіну!
КОШКА.
Не! Прыдумала: бяжы
Ды закручвай віражы.

Яны бегаюць па крузе, пакуль Мыш
не аказалася ў лапах.

Хочаш, я з павязкай буду.
Ёсць гульня "Хавайся ў бульбу".
Ты хаваешся...
МЫШ.
…ў нару?
КОШКА.
Ой, са смеху я памру.
*(Завязвае сабе вочы.)*
Ну, бяжы...
МЫШ. Бягу.
КОШКА. Хутчэй!
Я злаўлю і без вачэй.
*(Лёгка ловіць Мыш каля самай норкі.)*
Як гуляем мы цікава!



www.kamunikat.org

МЫШ *(бярэцца за галаву).*
Я прапала! Дрэнь забава!
*(Сабе.)*
Што, папалася, дурніца?
Кошка мышцы – не сястрыца.
*(Думае.)*
Дык чаму яна вучыла?
Быць хітрэйшай?
Вельмі міла. Паспрабую.
*(Кошцы, лісліва.)*
Дарагая,
Ты прыветная такая...
Незвычайная... Дальбог!
Вушкі! Ножкі! Галасок!
Я такіх не сустракала.
КОШКА.
Вось і мама мне казала...
МЫШ.
Ты астатнім не раўня,
Дык прыходзь сюды штодня.
*(Гладзіць Кошку па хвасце.)*
У кацінае пароды
Ёсць сапраўдныя уроды,
Выбачаюся... А ты
Ну не котка – дух святы!
КОШКА *(млее ад задавальнення)*.
Ну яшчэ б! Лавіць лаўлю,
Але шкурак не цярплю!
Пагуляю толькі крышку...
МЫШ *(у залу).*
І замучу гэтак мышку.
КОШКА.
Кампліменты чуць нязвычна...
МЫШ.
Заслужыла...
*(Ірванулася і ўцякла з кіпцюроў.)*

КОШКА *(азіраецца).*
Дзе здабыча?
Дзе мыша мая? Куды
Збегла?
МЫШ *(выглядваючы з норкі)*.
Далей ад бяды.
Хто хітрыць, як калабок,
Сам трапляе на кручок.
КОШКА
*(расчаравана разводзіцць лапамі).*
Зноў з пустымі... Як заўжды!

ЗАСЛОНА

www.kamunikat.org

# Змест

**П’есы для дарослых:**


НЕ МОЖА БЫЦЬ! 4 - 14
ЛЮБОЎ ЗА ЎСЁ МАЦНЕЙ 15 - 18
ЯК ЛІСКА ЗАЙЦА АБДУРЫЛА 19 - 23
ЯК ЗВЯРЫ ГАЗЕТУ ВЫПУСКАЛІ 24 - 38
СТАРЫ КАЖУХ 39 - 43
ТОТА, ЛЯПА І ПАНУРА 44 - 51


**П’есы для дзяцей:**


ЗБАН 53 - 57
ЯК ПТУШКІ ДУБ РАТАВАЛІ 58 - 62
ХТО РАШУЧЫ – ТОЙ ГЕРОЙ 63 - 71
КІСКА, НЕ ПАДМАНЕШ! 72 - 76


www.kamunikat.org

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Каржанеўская Галіна Анатольеўна

# Не можа быць

## Міні-п’есы

У аўтарскай рэдакцыі

Адказны за выпуск У. Кузьмін
Дызайн вокладкі І. Мацкевіч
Арыгінал-макет В. Бадзілоўская

Падпісана да друку 14.05.2010.
Фармат 60 х $81^{1/16}$. Папера афсетная.
Рызаграфія. Гарнітура Calibri.
Ум. друк. акр. 4,5. Ул.-выд. Акр. 1,7.
Замова 12. Тыраж 100 экз.

ТАА “Ковчег”
ЛВ № 02330/0548599 ад 09.07.2009 г.
Пр. Незалежнасці, 68-19, 220072 г. Мінск
Тэл./факс: (017) 284 04 33
e-mail: kovcheg_info@tut.by

www.kamunikat.org